


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЖНІЎНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 151 (29520)


# Шчыра – аб людзях, аб краіне, аб будучыні

## Падчас васьмігадзіннай «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» ніводнае пытанне не засталося без адказу



**«Вялікая размова з Прэзідэнтам» — фармат прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі, які з'явіўся чатыры гады таму. Дата чарговай прэс-канферэнцыі абрана невыпадкова. 9 жніўня — асаблівы дзень для ўсёй краіны. Выбары Прэзідэнта Беларусі 2020, якія адбыліся ў гэты дзень, сталі паваротным пунктам у развіцці краіны, запусцілі значныя сацыяльныя, палітычныя змены, якія будуць развівацца яшчэ шмат гадоў...**

**Таму цікавасць да ўчарашняй размовы зразумелая. Заяўкі асабіста прысутнічаць у зале падало амаль 1000 чалавек, арганізатары абралі менш за траціну — журналістаў (у тым ліку амаль 25 % з іх прадстаўлялі замежныя медыя), блогераў, грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў экспертнай супольнасці. І, дарэчы, рэкорд 2017-га быў пабіты: размова доўжылася 8 гадзін 15 хвілін. За гэты час было зададзена амаль 40 пытанняў, і ўсе рэспандэнты атрымалі ад кіраўніка дзяржавы разгорнутыя, змястоўныя адказы. Самыя значныя, самыя яркія выказванні Прэзідэнта па розных тэмах нашага жыцця мы сабралі ў дадзенай публікацыі.**

### Аб інтэграцыі Беларусі і Расіі

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што для інтэграцыі не патрэбна краінам уваходзіць у склад адна адной: ***«Мы суверэнная, незалежная дзяржава. Нашы людзі вельмі цэняць тое, што пасля многіх стагоддзяў мы сталі суверэннымі і незалежнымі.*** І калі я чую намёкі пра ўваход у склад Расіі, я заўсёды розумам Пуціна думаю: няўжо яшчэ адзін галаўны боль неабходны Расіі? Не. Свет змяніўся, для таго каб развіваць інтэграцыі ў эканоміцы, не трэба некага ўключаць у склад».

Прэзідэнт заўважыў, што Беларусь заўсёды была за цесную інтэграцыю, але менавіта расійскі бок трымаецца на адлегласці. Аснова любога саюза — роўныя правы ў эканоміцы і аднолькавыя цэны на энерганосьбіты, а гэтага пакуль дасягнуць не атрымліваецца.

***«Кажучы пра інтэграцыю, мы павінны дакладна разумець: без страты дзяржаўнасці і суверэнітэту»***, — дадаў Прэзідэнт.

Нагадаў ён і пра «дарожныя карты» — з 31 карты не атрымлівалася ўзгадніць апошнюю, дзе прапісана стварэнне наднацыянальных органаў Саюзнай дзяржавы. Гэты дакумент на сустрэчы прэзідэнты дзвюх краін вырашылі скасаваць. «У нас ёсць не наднацыянальныя органы, а сумесныя, ведамасныя органы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Працуе ж гэта. Навошта сёння ствараць, напрыклад, саюзнае міністэрства абароны. Не толькі мы, але і Расія на гэта не гатовая. Пачынаць трэба з адзінага закона, Канстытуцыі. Там усё павінна быць прапісана. Гэтага мы не зрабілі. Вырасла і нарадзілася цэлае пакаленне за гэтыя гады. Яны ўжо па-іншаму думаюць».

«Дарожныя карты», па яго словах, перафарматаваны ў саюзныя праграмы. Ужо гатовы 28 і засталося пытанне толькі па прыродным газе.

«Калі мы ў саюзе, то неабходна выраўноўваць цэны, ці адпусціць у свабоднае плаванне. Захацелі — купілі газ у «Газпрама», ці ў іншай кампаніі, якая ў вас здабывае прыродны газ. Свабодны павінен быць гандаль гэтым таварам. І адсюль будуць цэны. ***Мы не просім нізкіх цэн, мы хочам роўных цэн»***, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт паведаміў, што з расійскім калегам яны дамовіліся пераадолець усе бар'еры і ўраўнаваць умовы. Па яго словах, Вышэйшы дзяржаўны савет Саюзнай дзяржавы ў канцы года будзе этапны і там прымуць найважнейшыя рашэнні і многія «дарожныя карты».

Аляксандр Лукашэнка сцвярджае, што еўрапейскія санкцыі — гэта магчымасці для развіцця ўласных прадпрыемстваў, і краіны ўжо разам адказваюць на іх. «Чаму мы парымся з нагоды нейкіх санкцый. Мы дзве самадастатковыя краіны», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2



ISSN 1990 — 763X

# Шчыра – аб людзях,

Аляксандр Лукашэнка таксама адказаў на пытанне, калі прызнае Крым: «Калі апошні алігарх у Расіі прызнае Крым і будзе пастаўляць туды прадукцыю. За мной справа не заржавее. Хай мяне і звязвае Будапешцкая дэкларацыя. Але я і праз гэта пераступлю — Украіна глядзіце, што творыць. У мяне рукі развязаныя».

## Аб пратэстах пасля выбараў

Прэзідэнт расказаў, што на піку пратэстаў летась на вуліцы Мінска выходзіла амаль 47 тысяч чалавек. Адзначыў: гэта толькі 10-я частка тых, хто супраць яго. «Даюць карцінку: у натоўпе ідуць баевікі, адмарожаныя, уркі з заточкамі, моладзь, іншыя. І па краях стаяць марожанае жуюць, боршч ядуць разявакі — вось вам карцінка», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, сярод пратэстоўцаў было шмат тых, хто памыліўся, — у тым ліку і чыноўнікі высокага ўзроўню, якія і цяпер працуюць у дзяржаўных органах і ў Адміністрацыі Прэзідэнта. «Я не буду называць прозвішчы. Я з імі дзве гадзіны размаўляў. Яны кажуць: «Гвалт, гвалт, я супраць гвалту». Я расказваў, як гэта арганізоўвалася. А цяпер яны ўсё зразумелі. Я нікога не звольніў. Яны хаваюць вочы на нарадах, сустракаючыся са мной. Усякае бывае. Але ёсць тыя, з кім мы размаўляем як з ворагамі», — дадаў Прэзідэнт, адзначыўшы: з ініцыятарамі гвалту ў адносінах да яго дзяцей і сям'яў іншых дзяржаўных служачых будзе размаўляць «іх» мовай.

Прэзідэнт падзяліўся меркаваннем, што было б самым небяспечным, калі б парадак у краіне ў першыя дні пасля выбараў не ўдалося ўтрымаць: «Да гэтага часу ўркі, бандзюганы, мярзотнікі, тыя, хто марадзёрствам займаўся ўсюды, зляцеліся б да нас. І калі б тады мы пахіснуліся, назаўтра ўтварыўся б вакуум. І гэтыя мярзотнікі прайшліся б па нашых жанчынах, заняліся марадзёрствамі і цяжка было б спыніць».

Па словах Прэзідэнта, у яго быў і крайні варыянт, калі б склалі зброю ваенныя. «У мяне тры сыны, якія выдатна валодаюць зброяй. А за імі стаяць яшчэ некалькі соцень вельмі адданых людзей, як я. Нас бы хапіла, каб навесці парадак», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Тэма пратэстаў працягнулася пытаннем карэспандэнта брытанскага ВВС. Прэзідэнт сказаў, што акцыі апазіцыі не былі мірныя, і правёў паралелі з захопам бунтаўшчыкамі Белага дома.

«Якія гэта мірныя акцыі — выбухі, петарды і іншае? Яно ж відаць, адкуль ляцелі. Скажаце, што гэта ў адказ на «жорсткасць»? Ды не, яны прынеслі іх туды. Яшчэ гэтай «жорсткасці» не было. Заточкі, нажы, выбухоўка. Яны навошта гэта туды прынеслі на мірныя акцыі? ***Таму мірнымі акцыямі там не пахла.*** Прычым мы да гэтых акцый аднесліся мякчэй, чым ваш патрон ЗША» — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Ён заявіў, што пратэстоўцаў не збівалі, а бойню на вуліцах Мінска пачалі яны пры дапамозе замежжа. «Цытую былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Караева: «Мы вас першыя тры дні жывата-мі выціскалі з вуліц». А калі пачалі калоць жываты нашым ваенным, тады я аддаў каманду — паставіць усіх на месца без стральбы. Калі б у Палац Незалежнасці вы ўварваліся, калі я выходзіў з аўтаматам у суправаджэнні свайго дзіцяці на вуліцу, калі б вы толькі перайшлі мяжу — мяне ніхто не спыніў бы», — сказаў Прэзідэнт.



## Пра «катаванні» на Акрэсціна ў Мінску

«Адказваю пра катаванні на Акрэсціна. Гэта фэйк. Гэта няпраўда. Слухайце, а навошта іх катаваць? Там жа следства не вялі. Навошта катаваць там людзей? А калі там нехта і быў з сінякамі, дык яны атрымалі іх на вуліцы, калі рынуліся на ўнутраныя войскі і АМАП, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — А іх потым ужо затрымлівалі. У гэтым будынку, у памяшканні на Акрэсціна не было такой неабходнасці. Ніякіх там катаванняў не было. Гэта вы ўсё прыдумалі, таму што трэба было прыдумаць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Калі знесці цяпер Прэзідэнта — у Беларусі будзе бяда. Можа, нават Беларусі не будзе. Але ў вас гэта не атрымаецца. Таму супакойцеся. А санкцыі ўводзьце. Пажывём — пабачым, да чаго гэта прывядзе. Трэба супакоіцца, узяць галаву ў рукі і падумаць, як нам выходзіць з гэтай сітуацыі. Вы ж развязваеце трэцюю сусветную вайну. Вы што, да гэтага штурхаеце нас з расіянамі? Вы хочаце перамагчы ў гэтай вайне? Не будзе пераможцаў. А калі і будуць, то не вы. Давайце сядзем за стол перагавораў і пачнём гаварыць, як выйсці з гэтага становішча, таму што ўвязлі настолькі, што шляху назад не будзе. Гэта мая вам парада».

У сваю чаргу, адзін з журналістаў у зале заявіў, што ён ведае людзей, якія былі збітыя на Акрэсціна. Выслухаўшы яго, кіраўнік дзяржавы пацвердзіў факт, што такое адбывалася, аднак адзначыў, што атрымалі толькі тыя, хто парушаў закон. «Калі шчыра пачалі размаўляць, цяпер раскажу, хто атрымаў. На Акрэсціна трапіла шмат былых асуджаных. У тым ліку тыя, хто быў судзімы па дванаццаці артыкулах. Ведаеце, якія складваюцца адносіны паміж асуджанымі і, калі казаць груба, «ментамі»? У зняволеных паталагічная нянавісць да міліцыянераў, таму што яны лічаць іх вінаватымі ва ўсім. Суддзяў не чапаюць, а «ментоў» ненавідзяць. І вось калі яны, абдзяўбаныя, пракураныя і прапітыя, у якіх па 12 артыкулаў, убачылі сваіх ворагаў, адразу рынуліся на іх. А што міліцыянерам заставалася рабіць? Вось тых, хто рынуўся іх біць, звозіць рахункі, там і мачканулі», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адно пытанне пра мінулагодніх падзеі задала на сустрэчы прадстаўніца брытанскага тэлеканала SkyNews. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўсе прысутныя на сустрэчы журналісты заходніх СМІ задаюць адно і тое ж пытанне: пра нібыта збіваннях і катаваннях у Беларусі. «Акрэсціна — не санаторый. Кропка», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што калі журналісты гавораць пра катаванні ў месцах зняволення ў Беларусі, то яны павінны прыводзіць хоць якія-небудзь праўдзівыя доказы. «Давайце факты, я разбяруся, — сказаў ён. — А то «вы былі летась і бачылі скатаваных, збітых». Дайце мне хоць адну фатаграфію, мы цяпер іх знойдзем і спытаем, хто біў і дзе біў. Хто не хацеў быць пабіты, ён не быў на Акрэсціна. А той, хто прыйшоў на барыкады з нажамі і заточкамі, напэўна, атрымалі. Бывала, што і выпадкова трапіў разявака пад замес. У тых мы папрасілі прабачэння. Можа, не ва ўсіх папрасілі прабачэння. Знойдзем іх — папросім. Толькі вы на Захадзе не перажывайце наконт гэтага, таму што вам глыбока напляваць, каго тут збілі. Вам патрэбны чарговы хайп, чарговая хваля, каб «Лукашэнку даставіць у Гаагу». Але вы дрэнны інструмент для гэтага, не крыўдуйце».



## Пра замежных назіральнікаў і 17 верасня

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег Гайдукевіч запытаў у Прэзідэнта, ці мэтазгодна запрашаць на будучы рэферэндум па змяненнях у Канстытуцыю і на чарговыя выбары замежных назіральнікаў, якія загадзя рыхтуюць справаздачы, ці магчыма заканадаўча прапісаць вяршэнства нацыянальнага права над міжнародным, і выказаў пажаданне некаторых сваіх выбаршчыкаў зрабіць 17 верасня — Дзень народнага адзінства — выхадным. Прэзідэнт на такую прапанову адказаў, што столькі выхадных на святы, як у Беларусі, Расіі і Украіне, няма нідзе ў свеце. Але, магчыма, пасля змяненняў у Канстытуцыі гэтае пытанне вырашаць іншым чынам.

Што датычыцца прыярытэту нацыянальнага заканадаўства — трэба даследаваць, што страцім, а што атрымаем ад гэтага. «Але па той інфармацыі, якой я валодаю, я больш схіляюся да вашай прапановы», — дадаў Прэзідэнт.

Бліжэй да выбараў, сказаў Аляксандр Лукашэнка, вырашыцца пытанне і з запрашэннем замежных назіральнікаў.

***«Нам хаваць няма чаго. Мы павінны правесці рэферэндум адкрыта, па Канстытуцыі, якая будзе выпрацавана праектам на ўзроўні Прэзідэнта»***, — сцвярджае кіраўнік краіны.

## Аб беларуска-ўкраінскіх адносінах

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, беларуска-ўкраінскія адносіны сёння знаходзяцца на вельмі нізкім палітычным узроўні. «Нельга азмрочваць нашы адносіны рознага кшталту фэйкамі і гадасцю», — падкрэсліў беларускі Прэзідэнт. І прывёў у якасці прыкладу распаўсюджвання недакладнай інфармацыі гісторыю з кіраўніком «Беларускага дома ва Украіне» Віталем Шышовым, знойдзеным павешаным. Абвінавачанні ў датычнасці да гэтага гучалі ў бок Беларусі. «Хто ён такі для мяне і для Беларусі наогул? Добра, я, Прэзідэнт, мог бы яго не ведаць, але я ўпэўнены, што ў гэтай зале толькі тры-чатыры чалавекі яго і ведалі. Ён для нас быў проста ніхто. Які вар'ят у Беларусі возьме і пойдзе яго там вешаць? Ну навошта?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што заўсёды падтрымліваў Украіну і ўкраінскія ўлады і нават разумее, чаму яны, каб дагадзіць Захаду, робяць недружалюбныя крокі ў адносінах да Беларусі. «Добра, пабег за Захадам, плюнуў на ўсё, але навошта ты (Прэзідэнт Украіны. — **«Зв.»**) баевікоў рыхтуеш на тэрыторыі Украіны і зброю закідваеш да нас сюды? Бо зброя ідзе ў асноўным з Украіны. Цяпер мы, вядома, закрылі наглуха гэтую граніцу. Навошта вы гэта робіце, бо народы — гэта ж суседзі, гэта ж родныя людзі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь ніколі не ўварвецца ва Украіну, калі першы тое не зробіць украінскі бок.

«Менш за ўсё, каго вы павінны баяцца, — гэта беларусаў. Мы ніколі не зробім паскудства ў адносінах да Украіны, калі вы першыя не ступіце са зброяй на нашу зямлю», — сказаў кіраўнік краіны, звяртаючыся да ўкраінскага журналіста, які задаваў пытанне.

Ён таксама звярнуў увагу, што некаторыя крокі ўкраінскі бок зрабіў сабе на шкоду. «Вы закрылі авіязносіны ў Адэсу — каму вы горш зрабілі? Нашы пераарыентаваліся на Краснадарскі край, лётаюць у Турцыю — «Белавія» робіць трохі дугу. Турцыю мы не закрывалі, а маглі б увогуле не прымаць самалёты праз Украіну».

Таксама Прэзідэнт перасцярог украінцаў вяртаць Данбас ваенным шляхам і заклікаў сесці за стол перагавораў. На пытанне журналіста, на чыім баку беларускі лідар будзе, калі Украіна паспрабуе вырашаць пытанне сілавым шляхам, ён адказаў наступным чынам: «Калі вы зробіце гэта пры падтрымцы трэціх краін, я ніколі не буду на вашым боку. ***Калі вы зноў з Расіяй у Данбасе сутыкняцеся, я буду паміж вамі. Гэта даўно занятая мною пазіцыя. Нават калі гэта будзе пагражаць майму жыццю.*** Але я ўпэўнены, што ні першы, ні другі варыянт не рэальныя. Яго не будзе. Таму што разумных галоў ва Украіне дастаткова. ***Якая ў вас ва Украіне ні была армія б, любая ваша спроба сілай вырашыць пытанне скончыцца трагедыяй для Украіны»,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі заўважыў, што любая вайна заканчваецца мірам і за сталом перагавораў. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што трэба падзяляць пытанні Данбаса і Крыма.

## Пра Рамана Пратасевіча і Крысціну Ціманоўскую

Наконт былога кіраўніка экстрэмісцкіх тэлеграм-каналаў Рамана

# аб краіне, аб будучыні



Пратасевіча Прэзідэнт заўважыў, што было б працей, калі б той не прылятаў у Беларусь. Бо адказнасць за яго жыццё нясе гэтым часам кіраўніцтва краіны.

«Я сёння не рады, што ён апынуўся ў Беларусі. Мне было б працей, каб ён быў у Польшчы ці Літве. Чаму? Таму што яны яго «заказалі», — канстатаваў беларускі Прэзідэнт. — І мне трэба яго цяпер абараняць. Таму што не дай бог, калі здарыцца што з Пратасевічам, як з Шышовым, — крыць няма чым, злачынства на тэрыторыі Беларусі».

Наконт лёгкаатлеткі Крысціны Ціманоўскай (беларуская спартсменка, якая з Алімпіяды ў Токіа адмовілася вяртацца ў Мінск і выехала ў Польшчу) Прэзідэнт расказаў, што яе па патрабаванні МАК уключылі ў склад нацыянальнай каманды, выплачвалі стыпендыю, нягледзячы на нязначныя спартыўныя дасягненні і апазіцыйныя палітычныя погляды.

«Яна б сама гэтага не зрабіла, калі б ёю не кіравалі. Яна з Японіі, у Токіа звязалася са сваімі сябрукамі ў Польшчы, і ёй сказалі даслоўна: «Прыедзеш у аэрапорт, бяжы да японскага паліцэйскага і крычы, што тыя двое, якія падвозілі ў аэрапорт, — гэта супрацоўнікі КДБ». Хоць ні аднаго чалавека са спецслужбаў у Японіі не было. Мы не практыкуем гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра адносіны з Літвой і Польшчай

На пытанне літоўскага журналіста Прэзідэнт адказаў, што Беларусь і Літва — краіны-суседзі і ім наканавана жыць разам, у нейкі час адносіны будуць адноўлены, але Аляксандр Лукашэнка ні ў якім разе не прыме ўмоў у свой адрас.

«Але калі — залежыць сёння ад нас. Нядаўна такі «брудны прамень» прамільгнуў: маўляў, няхай Лукашэнка зробіць той і тое, і тады мы будзем пра нешта казаць. Вы мне ўмовы не стаўце. ***Вы не маеце на гэта права. Я не год і не пяць гадоў ва ўладзе. Я не хаваў у Беларусі ні баевікоў, ні апазіцыянераў — яны таксама ў вас у Літве ёсць — я ніколі гэтага не рабіў. Я не рабіў недружалюбных крокаў у дачыненні да Літвы»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што ў Беларусі няма палітычных вязняў, і чуць заявы пра іх наяўнасць з вуснаў заходніх палітыкаў неправамерна.

Прэзідэнт, адказваючы на пытанне польскай журналісткі, адзначыў, што гатовы на многае для нармалізацыі адносін і з Польшчай, але ініцыятыва павінна быць з іх боку.

«Мы вядзём дыялог. ***Кіраўніцтва Польшчы ўбачыла, у якое балота яно ўлезла... Паколькі мы не зусім дурныя людзі (палякі і беларусы), нам трэба выбудоўваць нармальныя адносіны»,*** — выказаўся Аляксандр Лукашэнка. Ён сказаў, што агульную мову знойдуць, але без прад'яўлення ўмоў Беларусі.

## Пра інтэрв'ю CNN і параўнанне з ЗША

Падчас «Вялікай размовы» Аляксандр Лукашэнка на запыт журналісткі CNN пагадзіўся даць інтэрв'ю гэтаму амерыканскаму тэлеканалу. «Я не выключаю гэтага. Пры адной умове: калі вы дасцё ўсё, што я скажу, не выразаючы, не дадаючы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Вось на гэтых умовах дамовіцеся з прэс-сакратаром».

Аляксандр Лукашэнка таксама прапанаваў журналістам CNN, якія нядаўна выпусцілі фэйкавы сюжэт пра наяўнасць пад Мінскам лагера для палітвязняў (насамрэч там аб'ект Міністэрства абароны) пабываць у гэтым раёне і паглядзець, што там знаходзіцца на самай справе.

На пытанне журналісткі аб нібыта фальсіфікацыі выбараў у Беларусі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў час прэзідэнцкіх выбараў у ЗША грамадзяне галасавалі па пошце, бюлетэні клалі ў сметнік, былі і іншыя шматлікія парушэнні. У той жа час Прэзідэнт заўважыў: калі б у Беларусі галасавалі па пошце, краіну парвалі б на кавалачкі.

«Вам — можна. Вы ствараеце беззаконнасць ва ўсіх месцах свету і мне кажаце пра нейкія рэпрэсіі. ***З майго боку не было ніякіх рэпрэсій. Я прыняў правілы гульні тых бандытаў, якія пад кіраўніцтвам амерыканскіх спецслужбаў рушылі да нас у суверэнную і незалежную дзяржаву. Я Прэзідэнт і па Канстытуцыі абавязаны абараніць гэтую дзяржаву. Што я і зрабіў»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Хто пасля?

«Каго беларускі народ выбера, той і будзе Прэзідэнтам. Якую я пры гэтым буду пазіцыю займаць, я не вызначыўся. Я думаю пра гэта», — адказаў Аляксандр Лукашэнка на пытанне карэспандэнта Russia Today «Хто наступны пасля вас?»

Прэзідэнт падзяліўся, што не ўяўляе, як будзе жыць на пенсіі, не займаючыся палітычнай дзейнасцю, але вельмі хутка прыйдзе іншы чалавек. «Не трэба гадаць, калі сыдзе Лукашэнка. Вельмі скора», — сказаў Прэзідэнт.

На думку кіраўніка краіны, будучы новы Прэзідэнт не з'явіцца ніадкуль — усе, хто можа быць Прэзідэнтам, на вачах.

«Аказваецца, ***у нас чалавек 15—20, якія могуць вырасці да Прэзідэнта. Яны ў чымсьці падобныя да мяне, бо я іх вырасціў, яны побач са мною раслі. Падобныя да мяне ў сваёй адданасці краіне. Яны надзейныя, не будуць шкамутаць нікога і большасць за іх прагаласуе»,*** — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Ён паабяцаў, што не будзе «праціскаць» на наступных прэзідэнцкіх выбарах нейкую кандыдатуру, а мае намер нават правесці размову з кандыдатамі ў прамым эфіры.

«Але ***перамогуць у Беларусі нармальныя, прагматычныя людзі»,*** — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Наконт перамены поглядаў былых чыноўнікаў Паўла Латушкі і Валерыя Цапкалы Прэзідэнт заўважыў, што крыўдна за іх, але не трагічна.

***«Мне шмат разоў здраджвалі. Я не прывык да гэтага, але зміры́ўся з гэтым. Як чалавек вопытны зразумеў: такое жыццё»,*** — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

## Аб паўнамоцтвах Усебеларускага народнага сходу

Прэзідэнт паведаміў, што ідэя надаць канстытуцыйны статус Усебеларускаму народнаму сходу зыходзіла ад яго.



«У Беларусі цяпер ідзе змена пакаленняў. Маё пакаленне сыходзіць, прыходзіць актыўнае новае. ***Нам неабходна захаваць баланс. Новае пакаленне не павінна выкінуць на абочыну старэйшае пакаленне. Гэты вопыт заўсёды спатрэбіцца»,*** — мяркуе кіраўнік краіны.

Старэйшае пакаленне палітыкаў павінна адысці, і Прэзідэнт бачыць іх у складзе УНС. Але пры гэтым, дадае, не павінна быць двоеўладдзя і ціску на новую маладую ўладу.

Прэзідэнт пакуль не ведае дакладна, якімі паўнамоцтвамі можна надзяліць УНС. ***«Але перадаваць паўнамоцтвы будзем толькі ў інтарэсах беларускай дзяржавы***, — дадаў кіраўнік краіны. ***— Гэта будзе сур'ёзнае пытанне для сур'ёзнага абмеркавання».***

Акрамя таго, легітымнасць выбараў, на яго думку, павінен вызначаць Канстытуцыйны суд, а не Цэнтральная выбарчая камісія.

Пракаментаваў кіраўнік краіны прапановы пра ўпамінанне нейтралітэту Беларусі ў Канстытуцыі. «Што датычыцца нейтралітэту, гэта не абмяркоўваецца. Гэта рашэнне Усебеларускага народнага сходу — тады ўсе бурна падтрымалі», — адзначыў беларускі Прэзідэнт. «Нейтралітэту няма фактычна. Па Канстытуцыі — нейтралітэт, а мы ўваходзім у склад ваенна-палітычнага блока АДКБ і гэтак далей. Правільна гэта ці не — вядома, правільна. Гэта дадатковы ўзровень бяспекі». Паводле яго слоў, Беларусь таксама ўваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз. «Пра які нейтралітэт можа ісці гаворка? — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму ***тут два варыянты: або мы вызначаем у Канстытуцыі, што мы не нейтральныя, альбо наогул туды нічога не запісваем».***

## Аб пытанні бежанцаў

Прэзідэнт расказаў, з чаго пачалася гісторыя з бежанцамі, якія праз Беларусь імкнуцца ў Еўрасаюз. «Паводле закона аб рэадмісіі яны (ЕС. — **«Зв.»**) у нас павінны былі пабудаваць адпаведныя памяшканні. Я сказаў, што ў нас няма грошай будаваць лагеры для людзей, якія да вас бягуць, потым вяртаюцца. Яны нам выдзялялі грошы і пачалі іх будаваць. А потым плюнулі, пачалі «змагацца з дыктатурай» і перасталі выконваць свае абавязацельствы. Калі вы перасталі, мы адказалі: мы тады не будзем іх лавіць, як лавілі раней», — акцэнтаваў увагу кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ён ніякім чынам не падштурхоўвае працэс актыўнасці бежанцаў, а самі краіны Еўрасаюза запрашаюць да сябе мігрантаў, бо не хапае рабочых рук.

Прэзідэнт расказаў яшчэ адну гісторыю з граніцы, як інсулінзалежнага бежанца, які ўпаў на прыгранічную літоўскую лінію, выратавалі беларускія пагранічнікі, і іх літоўскія калегі хвораму не дапамаглі. «Вы нас у чымсьці папракаеце? Папракайце. Але вы ж, праваабаронцы, бачыце, што тут адбываецца. Чаму не абараняеце гэтых людзей?» — задаў слушнае пытанне Прэзідэнт.

## Пра ваеннае супрацоўніцтва з Расіяй

Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі будуць размешчаны расійскія ваенныя базы пры небяспецы сусветнай вайны, а цяпер няма сэнсу ў гэтым.

«Ніколі Расія сюды не перасуне, тым больш ядзерныя боегалоўкі: яны будуць непасрэдна пад абстрэлам з тэрыторыі Польшчы і Літвы, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі трэба — усе Узброеныя Сілы будуць тут, таму што Беларусь для Расіі не чужая зямля, хто б ні быў тут Прэзідэнтам. І чужой не будзе».

Кіраўнік краіны паведаміў, што сродкі, сэканомленыя пры рэалізацыі праекта БелАЭС, плануецца накіраваць на набыццё ЗРС С-400 у Расіі. Развіваючы тэму ўмацавання парку ваенна-тэхнічнага абсталявання, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «У свой час мы зрабілі стаўку на зенітны ракетны комплекс «Тор-М2» — гэта добрая зброя. Мы ўмеем не проста ёю карыстацца, але і мадэрнізаваць, аднаўляць і рамантаваць, бо ўсё з часам зношваецца. У нас ёсць адпаведная тэхніка, завод па рамонце бранятэхнікі, некалькі прыватных прадпрыемстваў».

Ацаніў Аляксандр Лукашэнка па просьбе экспертаў работу беларускага КДБ і адзначыў, што спецслужба працуе ў цесным кантакце з ФСБ.

«Шмат што мы ў вас бяром, сёетое вы навучыліся ў нас, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы супрацоўнічаем. Вучымся. У нас вельмі шмат агульных задач. Дапамагаем адно аднаму. ФСБ дапамагае матэрыяльна».

«Мы зрабілі сур'ёзную работу над памылкамі. Сёння там новы старшыня, у КДБ, новыя людзі. Прыйшлі маладыя хлопцы, адданыя, надзейныя. Апошнія аперацыі, што праводзяць, — касмічныя. Ніколі не было, што яны не выканалі задачу так, як паставіў яе Прэзідэнт», — пахваліў сілавікоў кіраўнік краіны.

## Пра грамадзянства для ўкраінцаў і энергетычнае супрацоўніцтва

Прэзідэнт даручыў выпрацаваць схему спрошчанага атрымання грамадзянства да канца года для ўкраінцаў, якія працуюць на дабрабыт Беларусі.

«Я ведаю: і камбайнерамі працуюць, і некаторыя сем'ямі прыехалі, купілі пустыя дамы ў вёсках. Яны тут жывуць, маюць справу тут. Да канца года яны павінны стаць грамадзянамі нашай краіны, калі яны напішуць заяву», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што з улікам усіх перспектыў выкарыстання электраэнергіі магутнасці БелАЭС дазваляюць мець яшчэ лішак электраэнергіі, які можа атрымаць і Украіна. «Але вы так паводзіце сябе, прабачце мяне, брыдка», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Нагадаў ён і пра «антыдэмпінгавыя разборкі» па газасілікаце, іншых будматэрыялах.

«Не трэба так рабіць. Гэта ж эканоміка, а не палітыка, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — ***Вам не варта сябе так паводзіць і бразгаць санкцыйнай зброяй, таму што вы самі таксама вельмі залежныя».***

СТАР. 4

# Шчыра – аб людзях, аб краіне, аб будучыні

## Аб пераразмеркаванні ўлады

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў апошні час былі прынятыя рашэнні, па якіх некаторыя функцыі кіраўніка дзяржавы перайшлі іншым дзяржорганам. Працягваецца работа ўрада, якому даручана ўнесці кіраўніку дзяржавы прапановы, якія паўнамоцтвы размеркаваць на ведамасны ўзровень.

«Пакрысе мы перадаём. Але спрыт з боку ўрада (у асноўным ён уносіць дакументы) знік. Думаю, а ў чым справа? А таму што вельмі жорстка ўзяўся за гэтае пытанне: бярэш паўнамоцтвы — жорсткая адказнасць. І яны, некаторыя, так пакруцілі, паглядзелі: вось гэтыя пытанні цяпер узгадняе або вырашае Прэзідэнт, няхай будзе пакуль так, не будзем браць на сябе. Адказнасці баіцца хтосьці ці яшчэ чагосьці, але паменшылася жаданне атрымаць гэтыя паўнамоцтвы. Гэта я дакладна бачу», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што тэма пераразмеркавання паўнамоцтваў не знятая з парадку дня і сёлета згаданыя пытанні будуць урэгуляваныя.

## Аб адказнасці за заклікі да санкцый

Аляксандр Лукашэнка расказаў пра магчымасць увядзення адказнасці за заклікі да санкцый. Адпаведная прапанова была агучана ў маі на сустрэчы Прэзідэнта ў парламенце, дзе прысутнічалі і прадстаўнікі грамадскасці. Аляксандр Лукашэнка тады адзначыў, што дадзенае пытанне трэба прапрацаваць з юрыдычнага пункту гледжання. Заняцца гэтым ён папрасіў Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву.

«Я шчыра скажу, я атрымаў заключэнне, якое мяне не задавальняе. Маўляў, у нас у заканадаўстве ўжо ёсць гэтыя нормы. Ну добра, хай будзе масла масленае. Давайце адкрыта напішам — супрацьдзеянне і пакаранне за заклікі да санкцый. Давайце так і напішам», — адзначыў беларускі Прэзідэнт.

## Пра ўласныя радасць і расчараванне

Адказваючы на пытанне журналіста тэлеканала АНТ, Прэзідэнт расказаў, што яго здзівіла, расчаравала і парадавала летась.

«Узрадавала тое, што ў іх нічога не атрымалася, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Усюды былі, не скажу — здраднікі, але ачмурэлыя, звар'яцелыя. Думаю, іх засталося адзінкі».

«Мяне больш за ўсё радуе, што людзі нарэшце разабраліся. Радуе, што не было масавай здрады, якая магла быць сярод сілавых структур, сярод дзяржаўных органаў і гэтак далей. Я ўсведамляю, што некаторыя сядзяць пад плінтусам да гэтага часу. Але мы іх дастанем. ***Я сумленна і адкрыта сказаў: ніхто ў дзяржаўнай структуры працаваць не будзе, ніхто са здраднікаў»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

Разважаючы пра расчараванні за мінулы год, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Тое, што не трэба, я ўжо выкінуў з галавы, і не магу сказаць, што мяне расчаравала. Маглі б дзяржаўныя структуры і органы быць больш актыўныя і больш самастойныя, не чакаць указанняў».

## Аб стварэнні базы экстрэмісцкіх рэсурсаў

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, дадзенае пытанне абмяркоўвалася з Уладзімірам Пуціным. «У гэтым кірунку складана працаваць, але тут таксама прымем рашэнні. Мы абмяркоўвалі гэтае пытанне з Уладзімірам Уладзіміравічам. І яны працуюць у гэтым напрамку», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт лічыць, што тут магчымая каардынацыя, бо ў Беларусі і Расіі ўжо ёсць агульная база ў дачыненні да тых, каму забаронены ўезд на тэрыторыю дзвюх краін. «У асноўным гэта расійскія грамадзяне. Яны на кантролі ў нас і ў іх. Чаму ў гэтым пытанні не можа быць гэтак жа?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Аб праблемах у адукацыі

Прэзідэнт выразна пазначыў: адукацыя — найважнейшае пытанне. «Не вырашым праблемы ў адукацыі — не вырашым ніводнай праблемы ў грамадстве. Гэта наша самае балючае пытанне», — сказаў ён.

Беларускі лідар падкрэсліў: ***«І чакаць мы не будзем. З 1 верасня прымем усе рашэнні па навядзенні парадку ва ўстановах адукацыі, выпрацуем адпаведныя стандарты і падыходы, каб, навучаючыся там, яны разумелі, што гэта дзяржава бясплатна дае ім сілы і ўкладвае ў іх веды — падмурак іх будучага жыцця»,*** — адзначыў ён.

Яшчэ адзін важны момант у адукацыйным і выхаваўчым працэсе, на думку кіраўніка дзяржавы, — бацькі. ***«Без бацькоў школа нічога не зробіць.*** Я сам бацька. І я разумею: каб дзіця было паспяховае, яно павінна вучыцца. Але ў нас ёсць прабелы і сярод бацькоў. Думаю, пасля леташніх падзей бацькі зразумелі, што могуць страціць, і ў гэтых адносінах будуць уплываць на дзяцей. Школы, ВНУ, тэхнікумы, ПТВ мы падключым. ***Мы не будзем ні на кога ціснуць, мы проста навядзём парадак, установім стандарт, якому павінны ўсе адпавядаць.*** І гэта велізарны пласт, які мы адразу не падымем, каб перафарматаваць. А з 1 верасня пачнём дзейнічаць. будзем глядзець, што там у школах адбываецца. ***І ў ВНУ не будзем больш гадаваць праціўнікаў нашай дзяржавы. Але абавязкова маладыя людзі павінны мець свой пункт гледжання.*** Я быў у БДУ, калі было нямала гэтых пытанняў. Калі з імі размаўляеш, даносіш гэтыя пытанні, гэта ж зусім іншая моладзь, зусім іншыя людзі — яны разумеюць усё», — рэзюмаваў ён.

## Пра будучыню Беларусі

***«Я хачу, каб у нас была спакойная краіна, усё астатняе мы купім. Нам няшмат трэба. Каб купіць, мы грошы знойдзем. А ў асноўным сваімі мазгамі, сваімі рукамі ўсё вырабім, што мы і робім цяпер. Галоўнае — асабістае імкненне. Мы не будзем няволіць асабістую ініцыятыву людзей»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што спакой можа быць толькі тады, калі для гэтага ёсць нармальная эканамічная аснова, калі ў людзей ёсць работа. «Калі чалавек хоча і можа, ён у Беларусі заўсёды зробіць. Хто не можа — мы заўсёды падтрымаем такіх людзей», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Фота БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1–3-й стар.)*

Меркаванні і ўражанні

# «Такую «Вялікую размову» палітыкі праводзяць толькі ў тым выпадку, калі ў іх ёсць гісторыя»

**Блогер Дзмітрый ВЫСОЦКІ** прыехаў у Мінск з Херсонскай вобласці, горада Новая Кахоўка, каб асвятляць для ўкраінцаў беларускія падзеі.

«Гэтую сустрэчу я лічу сур'ёзнай, сюды маглі трапіць прадстаўнікі любога СМІ — амерыканскага, еўрапейскага і задаць свае пытанні адносна «дыктатуры», праблемы бежанцаў, падзей з Раманам Пратасевічам. Але я сумняваюся, што многія замежныя апазіцыйныя СМІ збіраліся сюды трапіць», — сказаў блогер.

Па яго словах, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні нацыянальнага значэння — адносіны з Расіяй, Украінай, Літвой. «Мяне больш за ўсё крыўдзіць тое, што кіраўніцтва маёй краіны вельмі няправільна паводзіць сябе ў адносінах да дзеючага Прэзідэнта і ўсіх беларусаў. Яны ставяць палкі ў колы ў сферы эканомікі, робяць рэзкія выказванні. Я вельмі спадзяюся, што мы знойдзем выйсце з сітуацыі і выйдзем з крызісу ўзаемаадносін», — дзеліцца Дзмітрый Высоцкі.

Ён запэўнівае, што мільёны ўкраінцаў падтрымліваюць беларускую ўладу, але гэтую інфармацыю не публікуюць украінскія СМІ.



Фота БелТА.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ГАЙДУКЕВІЧ** у размове з журналістамі абурыўся, што назіральнікі пэўных заходніх краін яшчэ да пачатку выбарчай кампаніі ў Расіі і Беларусі загадзя рыхтуюць справаздачу аб яе незаконнасці.

«У мяне пытанне: ці ўвогуле неабходна нам іх запрашаць і марнаваць свой час. Мне цікава было даведацца меркаванне Прэзідэнта, ці неабходна нам прапісаць у Канстытуцыі, што нацыянальнае заканадаўства ў прыярытэце над міжнародным. Мы бачым, што адбываецца ў свеце з міжнародным правам, калі ўводзяцца незаконныя санкцыі, калі ў адносінах да краін вядуць гібрыдную вайну і пры гэтым ссылаюцца на міжнароднае заканадаўства», — сказаў дэпутат.

Ён падкрэслівае, што па вопыце шматлікіх прэс-канферэнцый з Прэзідэнтам упэўніўся: Аляксандр Лукашэнка размаўляе вельмі шчыра, падымае шырокі спектр пытанняў.

Алег Гайдукевіч з задавальненнем адзначыў, што ў размове ўдзельнічала вялікая колькасць журналістаў, шмат замежнікаў, запрасілі блогераў, лідараў меркаванняў сярод моладзі.

«Гэта дазволіць данесці пункт гледжання кіраўніка краіны да больш шырокіх слаёў насельніцтва. Гэта вельмі шчырая размова, бо людзі прыйшлі з вострымі, актуальнымі пытаннямі, якія хвалююць іх. А паразмаўляць было пра што. Прайшоў год з прэзідэнцкіх выбараў. І тыя, хто ў жніўні меў адно меркаванне, на многія падзеі паглядзелі па-іншаму. Яны ўбачылі, што была спроба вырашыць лёс краіны на вуліцы, што тыя, хто крычыць на Захадзе аб свабодзе, думаюць толькі пра сябе»,— сцвярджае парламентарый.

**Параалімпіец Аляксей ТАЛАЙ** гэтымі днямі рыхтуецца да паездкі ў Токіа, дзе будзе спаборнічаць за медалі, але, нягледзячы на цесны графік, ён ніяк не змог прапусціць «Вялікую размову з Прэзідэнтам».

«Тут сабралася вялікая колькасць неабыякавых грамадзян Беларусі, людзі, што праявілі сябе актыўнай работай у сацыяльных сетках. У інтэрнэце фарміруецца пул блогераў, якія разумеюць, што ад іх многае залежыць у лёсе дзяржавы. Сёння мы ўсвядомілі ролю кожнага з нас, ролю чалавека на сваім месцы, калі не толькі кіраўнік краіны павінен працаваць у поўнай меры, але і мы, простыя людзі», — сказаў спартсмен.

Ён дадае, што прэс-канферэнцыя — магчымасць пачуць новае, пачарпнуць ідэі, размова — і крыніца мудрасці ад кіраўніка краіны па разуменні глабальнага парадку ў свеце.

«Наша краіна паказала свету тое, як людзі з моцным лідарам могуць супрацьстаяць агрэсіі і майданным тэхналогіям, якія прыводзяць да дзяржаўнага перавароту, крыві», — акцэнтуе Аляксей Талай.

**Вядомы расійскі журналіст, гендырэктар кампаніі «Говорит Москва» Уладзімір МАМАНТАЎ** адзначыў, што Аляксандр Лукашэнка — мудры, аўтарытэтны палітык і адказы на ўсе пытанні былі актуальныя.

«Такую «Вялікую размову» палітыкі праводзяць толькі ў тым выпадку, калі ў іх ёсць гісторыя, калі прысутныя людзі разумеюць сэнс сустрэчы, бягучы момант», — сказаў журналіст.

Ён дадае, што многія журналісты задаюцца пытаннем, якія наступствы для Саюзнай дзяржавы прынясуць сённяшнія складанасці ў свеце.

«Ці стане наш саюз больш трывалы? Калі стане больш трывалы, то ў якіх напрамках? У якіх напрамках мы будзем дзяліцца адзін з адным суверэнітэтам? Кожны саюз мае на ўвазе абмен суверэнітэтам. Калі Акадэмія навук Беларусі падпісвае пагадненні з Курчатаўскім універсітэтам — гэта значыць, што мы падзяліліся вельмі важным. І так ва ўсім», — акцэнтуе ўвагу Уладзімір Мамантаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Парламенцкі дзённік

# «Работа са зваротамі грамадзян — ключавы кірунак у дзейнасці любога дзяржоргана і любога кіраўніка»

**Гэта адзначыла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас выязнога пасяджэння прэзідыума верхняй палаты парламента, якое прайшло сёння ў Мінгарвыканкаме. На сустрэчы з удзелам кіраўніцтва сталіцы і дэпутатамі гарадскога Савета падвялі вынікі работы Мінгарвыканкама са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб сёлета за першае паўгоддзе.**



Фота БелТА.

«Работа са зваротамі грамадзян — ключавы кірунак у рабоце любога дзяржоргана і любога кіраўніка, — сказала Наталля Качанава. — Актуальнасць гэтага пытання ніколі не будзе зніжаць сваёй вастрыні. Прэзідэнт зусім нядаўна на сустрэчы з «вертыкаллю» зноў агучыў пытанне, што з людзьмі неабходна працаваць: умець чуць іх і слухаць. І пра гэта кіраўнік краіны кажа не першы раз. Ад таго, як працуюць мясцовыя органы ўлады, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый у гэтым напрамку, залежыць у цэлым і давер да ўлады, і грамадска-палітычная сітуацыя ў любым раёне, горадзе нашай краіны».

Спікер Савета Рэспублікі нагадала, што ўчора былі праведзеныя выязныя прыёмы грамадзян ва ўсіх раёнах Мінска. Па яе словах, на прыём запісалася шмат мінчан, і Наталля Качанава прыняла рашэнне правесці яшчэ адну сустрэчу з жыхарамі сталіцы.

«Я думаю, што пытанні, якія мы не паспелі з людзьмі абмеркаваць, перадалі ў пісьмовым выглядзе. І мы накіруем іх для разгляду ў адміністрацыі раёнаў, гарвыканкам, кіраўнікам рэспубліканскіх органаў улады», — дадала старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава сцвярджае, што практыка выязных прыёмаў паказала: каля 30 % праблем грамадзян вырашаецца імгненна пасля запісу на прыём да членаў Савета Рэспублікі.

«Часам кажуць, што чамусьці людзі не звяртаюцца ў мясцовыя органы ўлады, а адразу ідуць у вышэйшыя інстанцыі. Я не падзяляла б, куды звярнуўся чалавек. Важна, каб быў вынік у вырашэнні пытанняў», — мяркуе кіраўнік верхняй палаты парламента.

Паводле яе слоў, асаблівую ўвагу неабходна ўдзяляць паўторным, калектыўным зваротам грамадзян, што накіроўваюцца ў вышэйстаячыя інстанцыі.

Наталля Качанава заклікае хутка рэагаваць і на праблемы, якія неабходна ўрэгуляваць заканадаўча, у тым ліку просіць займацца такімі зваротамі дэпутацкі корпус.

«Дэпутацкі корпус сёння ў нашай краіне — гэта 18 100 чалавек. Калі браць сумяшчальніцтва, то атрымліваецца каля 16 тысяч чалавек. Гэта вялізная армія людзей, якая абрана народам. І вы павінны чуць тое, пра што кажуць людзі, і павінны ўносіць больш настойліва прапановы па рашэнні праблем», — адзначае Старшыня Савета Рэспублікі.

Па яе словах, сярод асноўных праблем, з якімі звярталіся мінчане, — жыллёва-камунальная гаспадарка, будаўніцтва, ахова здароўя.

**Загадчык аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі сакратарыята Савета Рэспублікі Вольга НЯДВЕЦКАЯ** ў дакладзе паведаміла, што ў першым паўгоддзі 2021 года членамі Савета Рэспублікі разгледжана больш за 3700 зваротаў — амаль на 25 % больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Як дадала спецыяліст, практычна кожны другі зварот у Савет Рэспублікі — паўторны.

«Дадзеная тэндэнцыя выклікае занепакоенасць, бо яна захоўваецца на працягу двух гадоў і сведчыць пра неадпаведны разгляд зваротаў на месцах, у сувязі з чым грамадзянам неабходна звяртацца ў Савет Рэспублікі паўторна», — сказала Вольга Нядвецкая.

Найбольшая колькасць зваротаў са сталіцы прыходзіць ад жыхароў Фрунзенскага, Ленінскага, Маскоўскага і Заводскага раёнаў.

Спецыяліст адзначае сацыяльна-палітычную актыўнасць грамадзян — у тры разы павялічылася колькасць карэспандэнцыі па пытаннях «грамадства», «палітыка».

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Надвор'е

# ЦЁПЛА, АЛЕ ЎМЕРАНА

### І ўвесь тыдзень — няўстойліва

**Умерана цёплае надвор'е чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Новы тыдзень у Беларусі пачынаецца з умерана цёплага, але няўстойлівага надвор'я. Вызначальны ўплыў аказваюць атмасферныя франты і няўстойлівыя паветраныя масы, якія распаўсюджваюцца з паўднёвага захаду Еўропы, адзначылі сіноптыкі.

У аўторак, 10 жніўня, надвор'е будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў няўстойлівай паветранай масе. У асноўным будзе без ападкаў, толькі днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10-16 градусаў, месцамі па ўсходзе да плюс 18. Днём паветра прагрэецца да 23-29 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе месцамі да плюс 30.

У сераду, 11 жніўня, пры праходжанні атмасфернага фронту ноччу месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература ў начны час будзе плюс 10-17, у дзённыя — плюс 20-27, па паўднёвым усходзе — плюс 28-30 градусаў.

У чацвер, 12 жніўня, на тэрыторыю Беларусі будзе паступаць няўстойлівая, халаднейшая паветраная маса. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10-17. Днём паветра прагрэецца да плюс 18-24, месцамі да 26 градусаў цяпла.

У пятніцу, 13 жніўня, з ростам атмасфернага ціску прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі па паўночным усходзе Беларусі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ў начны час складзе плюс 10-16 градусаў, у дзённыя — плюс 20-27 градусаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Ну і ну!

# Знайшоў у лесе... кулямёт

**У Гродзенскім раёне мужчына пайшоў у лес у ягады і знайшоў кулямёт «Максім». Гэта адбылося каля вёскі Сапоцкін.**



Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, мясцовы жыхар паглыбіўся ў лес на некалькі дзясяткаў метраў, калі ўбачыў металічны прадмет, падобны на трубу, што тырчаў з зямлі. Раскапаўшы знаходку, з грунту ён дастаў цэлы кулямёт часоў Вялікай Айчыннай вайны. Прынамсі, вонкава зброя была ў даволі нядрэнным стане.

Мужчына з'яўляецца паляўнічым і ведае, як паступаць у выпадку выяўлення падобных прадметаў, — ён неадкладна паведаміў аб знаходцы ў міліцыю. Цяпер вырашаецца пытанне далейшага лёсу кулямёта — магчымы сцэнарый, што зброю могуць перадаць у адзін з музеяў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Фота з сайта УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

## У цэнтры ўвагі

# ЯКАСЦЬ, ДАСТУПНАСЦЬ І АСАРТЫМЕНТ

**Камітэт дзяржаўнага кантролю правядзе «гарачыя» лініі ва ўсіх абласцях і сталіцы па пытаннях якасці і даступнасці для насельніцтва тавараў школьнага асартыменту. Яны пройдуць з 10 да 12 жніўня.**

Можна будзе выказаць меркаванне (у тым ліку ананімна) аб асартыменце прапанаваных у гандлі напярэдадні новага навучальнага года тавараў для дашкольнікаў і школьнікаў, іх цане, а таксама ўнесці прапановы па дзейнасці школьных кірмашоў.

Камітэт дзяржаўнага кантролю прапануе таксама выказаць сваё меркаванне пра недахопы ў дадзенай сферы і па суб'ектах прадпрымальніцтва, якія займаюцца вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў для дзяцей.

10 жніўня «гарачая» лінія будзе працаваць у двух рэгіёнах: у Гомельскай вобласці — з 10.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 па тэл. 8 (0232) 23-83-68 і 8 (0232) 23-83-98; у Брэсцкай вобласці — з 9.00 да 18.00 па тэл. 8 (0162) 21-18-40 і 8 (0162) 21-18-52.

Камітэт дзяржкантролю Віцебскай вобласці арганізуе гарачую лінію 10 і 11 жніўня. На працягу двух дзён з 10.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 можна будзе патэлефанаваць спецыялістам абласнога КДК па тэл. 8 (0212) 37-54-53 і 8 (0212) 37-61-78.

На 11 жніўня правядзенне тэматычнай «гарачай» лініі запланавана ў Магілёўскай вобласці (з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 па тэл. 8 (0222) 62-49-34) і ў Мінскай вобласці (з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 па тэлефоне 8 (017) 374-47-82).

Таксама 11 жніўня на «гарачую» лінію КДК змогуць звярнуцца і жыхары Мінска. Яна адбудзецца з 10.00 да 13.00 па тэл. 8 (017) 328-69-40.

У Гродзенскай вобласці «гарачая» лінія пройдзе 12 жніўня з 10.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 па тэл. 8 (0152) 79-88-13 і 8 (0152) 79-88-31.

Дзяржаўныя кантралёры прааналізуюць усю інфармацыю, што паступіла, разгледзяць выкладзеныя ў зваротах факты і канструктыўныя прапановы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## На Кубе дазволілі адкрываць малыя і сярэднія прыватныя прадпрыемствы



Згодна з новымі правіламі, жыхарам Вострава Свабоды можна ствараць прыватныя прадпрыемствы з колькасцю супрацоўнікаў да ста чалавек. Такое рашэнне стварае юрыдычную базу для многіх кубінцаў, якія ўжо працуюць у прыватным сектары, і дазваляе законным чынам адкрываць прыватныя прадпрыемствы ў самых розных сферах эканомікі. Эксперт па развіцці бізнесу на Кубе Аніель Дыяс заявіў Франс-Прэс, што новы законапраект — паваротны момант, якога жыхары з нецярпеннем чакалі многія гады. «Для кубінскай эканомікі гэта гіганцкі крок, які будзе мець наступствы ў сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт Кубы Мігель Дыяс-Канель заявіў, што краіна прадпрымае рашучыя крокі па абнаўленні сваёй эканамічнай мадэлі.

## Брытанскія ўлады звярнуліся да вайскоўцаў з-за дэфіцыту прадуктаў у крамах



Войска Вялікабрытаніі задзейнічаюць для дастаўкі прадуктаў і медыкаментаў са складоў у супермаркеты з-за недахопу кіроўцаў грузавікоў, паведаміла Daily Mail. Як вядома, у канцы чэрвеня Асацыяцыя аўтамабільных грузаперавозак папярэдзіла аб недахопе 100 тысяч кіроўцаў грузавікоў, што абцяжарвае дастаўку прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці. Крызіс у дадзенай сферы паўстаў пасля выхаду каралеўства са складу Еўрасаюза, у сувязі з чым многія дастаўшчыкі вырашылі пакінуць Вялікабрытанію. Для ліквідацыі праблемы павінны падключыць каля дзвюх тысяч вайскоўцаў. Патэнцыяльным кіроўцам трэба будзе здаць экзамены на атрыманне правоў.

## У Рыме арыштавалі боса італьянскай «Каморы» па мянушцы Крывавая Мэры



Італьянскія карабінеры арыштавалі Марыю Лічардзі. Яна, як мяркуе Неапалітанскае ўпраўленне па барацьбе з мафіяй, узначальвае злачынны клан з буйной злачыннай групоўкі «Камора», паведаміла газета La Stampa. Затрыманне было праведзена ў рымскім аэрапорце «Чампіна», адкуль 70-гадовая жанчына збіралася вылецець у Іспанію. Карабінеры арыштавалі яе ў момант здачы багажу. Лічардзі, як лічаць праваахоўнікі, кіравала аднайменным злачынным кланам, які заснаваў яе брат Джэнара па мянушцы Малпа. Ён памёр у турэмнай камеры ў 1994 годзе. Клан Лічардзі займаўся рэкэтам, незаконным гандлем, махінацыямі на аўкцыёнах і адмыванием злачынных даходаў.

# БЕЛАРУСКАЯ КНІГА: ПОПЫТ НЕ ЗМЯНШАЕЦЦА

## Хутка пачуць літаратурную класіку можна будзе праз мабільную праграму

**У першым паўгоддзі бягучага года ў краіне зноў пасля пандэмічнага спаду актывізавалася кнігавыдавецтва. Пра гэта расказаў журналістам начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.**




Так, за шэсць месяцаў 2021 года было выдадзена 4647 найменняў кніг агульным тыражом 10 мільёнаў 40 тысяч асобнікаў. У параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года, колькасць выдадзеных кніг па колькасці найменняў вырасла на 19,4 %, а па тыражы — на 11,1 %. На думку спецыяліста, гэта добры знак — рост сведчыць аб тым, што людзі хочуць чытаць і бачыць новыя кнігі.

Выдавецкай дзейнасцю і распаўсюджваннем кнігадрукавання займаюцца ў краіне 523 суб'екты гаспадарання.

Найбольшым попытам у чытачоў і пакупнікоў карыстаюцца дзіцячая літаратура, навукова-папулярная літаратура — у першую чаргу, для школьнікаў малодшага і сярэдняга ўзросту. «Аднак, на мой погляд, не хапае літаратуры, скіраванай на патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне — кніг пра любоў да Радзімы, роднай зямлі, бацькоў... Кніг, што выхоўваюць у падрастаючага пакалення павагу да старэйшых, да працы. Каб яго прадстаўнікі ведалі, што нічога дарма не даецца, што каб дасягнуць нечага ў жыцці, стаць паспяховымі, трэба шмат працаваць, — падкрэсліў начальнік упраўлення. — У савецкія часы было шмат такой літаратуры (і мастацкай, і навукова-папулярнай), дзе аўтарамі выступалі вучоныя, псіхолагі і самі бацькі».

Уладзімір Андрыевіч адзначыў, што дзяржава шмат увагі аддае выданню кніг. Кожны год фарміруецца тэматычны план сацыяльна значнай літаратуры.

— Па рэкамендацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі ў нас выдаецца ў год 15-18 кніг беларускіх аўтараў, якія накіроўваюцца ў публічныя бібліятэкі краіны. Мы плённа працуем з Міністэрствам адукацыі: кожны год тыражамі больш за 20 тысяч экзэмпляраў выдаюцца хрэстаматыі, дапаможнікі па вучэбных прадметах. Акрамя таго, штогод абнаўляюцца і падручнікі. Важна, каб якасныя кнігі з'яўляліся ў школах, на паліцах кніжных крамаў і ў сем'ях. Хацелася б таксама, каб нашы выдавецтвы выпускалі больш і класікаў беларускай літаратуры, і сучасных аўтараў, — падкрэсліў Уладзімір Андрыевіч.

Між іншым, на апошнім міжнародным конкурсе «Мастацтва кнігі дзяржаў — удзельніц СНД» беларускія кнігавыдаўцы не перамаглі толькі ў адной намінацыі — «Кнігі для дзяцей і юнацтва», дзе іх абышлі калегі з Казахстана і Арменіі. Але нашы кнігі саступілі не па змесце, а па сваім афармленні. Беларускія кнігавыдаўцы прытрымліваюцца класічнага афармлення, але інфармацыйныя тэхналогіі імкліва развіваюцца. Сучасныя дзеці здольныя апрацоўваць адначасова шмат інфармацыі, пры гэтым у іх добра развітая зрокавая памяць. У кнігах, якія перамаглі, была «кліпавая» падача тэксту.

Днямі будуць абвешчаны пераможцы рэспубліканскага творчага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія — 2021», дзе выразна прасочваецца існаванне дзвюх праблем. Адна з іх — дэфіцыт кніг маладых аўтараў. Сёлета на конкурс паступілі ўсяго чатыры заяўкі — дзве ад гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (СПБ), дзе шмат працуюць з маладымі аўтарамі, дапамагаюць ім выдаць першую кнігу, адна — ад Мінскага абласнога аддзялення гэтай арганізацыі і яшчэ адзін аўтар заявіўся на конкурс самастойна.

«Вызначаць найлепшага сярод чатырох было складана, хоць мы і разумеем, што прэмія — у нейкім сэнсе аванс для аўтара-пачаткоўца. Але ў нас шмат літаратурных старонак у раённых і абласных газетах. Дык няўжо няма маладых аўтараў, якіх можна было б падтрымаць і дапамагчы ім выдаць сваю першую кніжку, нават тоненькую, хоць невялікім тыражом? Другая праблема — у нас трэці год запар не вызначаецца пераможца сярод драматургічных твораў, таму што для конкурснай сітуацыі павінна паступіць сама меней дзве заяўкі. А адсутнасць драматургічных твораў — гэта праблема таксама і для беларускіх тэатраў, і для кінематографа», — падкрэсліў Уладзімір Андрыевіч.

На працягу многіх гадоў грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» праводзіць даследаванне папулярнасці беларускіх кніг у публічных бібліятэках. Пра гэта паведаміў **намеснік старшыні творчага саюза Анатоль МАТВІЕНКА.**

— Мы вельмі хваляваліся, што ў 2020 годзе, складаным і ў палітычным, і ў эпідэмічным плане, знізіцца цікавасць чытачоў да публічных бібліятэк, таму ў параўнанні з даследаваннямі мінулых гадоў, якія ахоплівалі роўна два гады, дадалі дадатковыя тры месяцы для кампенсацыі чаканага зніжэння попыту на кнігу ў публічных бібліятэках. Аднак нашы асцярогі былі марныя — беларусы не адмовіліся ад наведванняў бібліятэк, — канстатаваў Анатоль Матвіенка.

У поле зроку трапілі даныя па 1 097 942 кнігах. Да іх звярталіся 1 212 967 разоў. Пад увагу браліся кнігі ўсіх аўтараў, незалежна ад іх членства ў тым ці іншым творчым саюзе, а таксама аўтараў, якія ні ў якія творчыя саюзы не ўваходзяць.

Па вопыце мінулых гадоў эмпірычным шляхам было ўстаноўлена, што кнігу варта прызнаць актуальнай, калі чытач звяртаецца да яе не радзей як раз на два гады, гэты паказчык умоўна прыняты за 100 %. Прыкладна такі ён быў у папярэдніх гады. Апошняе даследаванне дало лічбу ў 110 % — прырост паказчыка прыкладна прапарцыянальны павелічэнню перыяду даследавання. А значыць, цікавасць да айчыннай літаратуры не падае і ў складаны ковідны час.

Тройка пісьменнікаў-лідараў не змянілася. Найбольшая колькасць зваротаў да кніг зафіксаваная ў трох празаікаў Саюза пісьменнікаў Беларусі — Мікалая Чаргінца, Наталлі Батраковай і Георгія Марчука. Добрым попытам карыстаецца і паэзія Міхася Пазнякова. У аўтараў-«рэкардсменаў» адну кнігу бяруць у бібліятэцы 6-8 разоў на год.

Анатоль Матвіенка таксама анансаваў новы праект Саюза пісьменнікаў Беларусі, «Белкнігі» і Міністэрства інфармацыі — мабільную праграму «Чытанка», якая дазволіць праслухоўваць творы беларускіх пісьменнікаў у аўдыёфармаце. «Чытанка» будзе даступная для бясплатнага спампоўвання. Мяркуецца, што яе прэзентацыя адбудзецца на Дні беларускага пісьменства ў Капылі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Запрашальнік

# КІРМАШ, ЯКОМУ ТРЫ СТАГОДДЗІ

**20—22 жніўня ў Зэльве адбудзецца чарговы фестываль «Ганненскі кірмаш», які збірае гасцей на працягу 300 гадоў. Па сучаснай традыцыі яго наведвае шмат беларускіх і замежных турыстаў.**

А пачалася гісторыя кірмашу ў XVIII стагоддзі. Калісьці ён лічыўся адным з найбуйнейшых у Еўропе па тавараабароце і колькасці гандляроў, — і саступаў толькі Лейпцыгскаму. Традыцыйным сімвалам кірмашу з'яўляецца конь, бо коні заўсёды былі там галоўным таварам.

Сёлета ў кірмашы возьме актыўны ўдзел грамадскасць пяці раёнаў Гродзенскай вобласці: Слонімскага, Ваўкавыскага, Свіслацкага і Зэльвенскага, а таксама госці з усёй Гродзенскай вобласці і іншых рэгіёнаў краіны. Як абяцаюць арганізатары, мерапрыемства стане грандыёзным і запомніцца яго гасцям і ўдзельнікам на многія гады.

21 жніўня на цэнтральнай плошчы гарадскога пасёлка адбудзецца тэатралізаванае дзейства, кульмінацыя якога — прыбыццё на кірмаш князя Антонія Казіміра Сапегі і яго світы. Але ў цэнтры ўвагі на кірмашы, безумоўна, будуць коні. Усе, хто пажадае, атрымаюць магчымасць пакатацца на возе ці на брычцы, а таксама вывучыць асновы верхавой язды.

У час кірмашу пройдуць конкурсы сельскагаспадарчых падворкаў, гандлёвых месцаў, творчых калектываў. Госці і жыхары Зэльвы паўдзельнічаюць у конкурсе на самага актыўнага пакупніка і, калі пашанцуе, атрымаюць галоўны прыз латарэі — каня. На кірмашы можна будзе набыць рамесныя вырабы, адбудзецца конкурс-пленэр майстроў па вырабе фігурак коней і падкоў з саломы. Будуць працаваць атракцыёны для дзяцей, разнастайныя выстаўкі. Святочную атмасферу створаць музыкі, танцоры, мастакі, аніматары. Для аматараў прыгожай музыкі створана праграма з удзелам творчых калектываў Рэспублікі Беларусь. Мясцовыя жыхары і госці свята атрымаюць магчымасць набыць разнастайныя тавары ў гандлёвых радах, падсілкавацца на пляцоўках фуд-корта.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

Цэнаўтварэнне

# ЛЕКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАСТУПНЫЯ

### Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю спыніла завышэнне цэн на лекавы сродак «Ларатадзін»

**У выніку аналізу інфармацыі, атрыманай МАРГ ад адной з аптэчных сетак, устаноўлена парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб цэнаўтварэнні.**

Вытворцам пры фарміраванні адпускной цаны на лекавы сродак «Ларатадзін» допушчана павелічэнне кошту прэпарату на 4,4 працэнта пры ўстаноўленым абмежаванні не больш за 0,2 працэнта ў месяц у адпаведнасці з вядомай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 100 «Аб часовых мерах па стабілізацыі цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці».

Розніца паміж фактычнай выручкай, атрыманай ад рэалізацыі «Ларатадзіна» па завышанай цане, і разліковай велічынёй выручкі па цане, устаноўленай у адпаведнасці з заканадаўствам, склала 1184,72 рубля.

Па дадзеным факце Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў дачыненні да вытворцы (як гаспадарчага суб'екта, так і яго службовай асобы, адказнай за дапушчанае парушэнне), складзены і накіраваны ў Эканамічны суд Мінска пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні. Прадпрыемству пагражае штраф у двухразовым памеры розніцы паміж фактычнай і разліковай велічынёй выручкі, гэта значыць, у дадзеным выпадку больш за 2,3 тысячы рублёў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Крымінал

# Браканьера выявілі праз фотапастку



**Супрацоўнікамі Мазырскай міжрайінспекцыі сумесна з супрацоўнікам Калінкавіцкага РАУС апрацавана зафіксаваная фотапасткай, устаноўленай ва ўгоддзях «Ляскавічы», інфармацыя аб незаконным паляванні жыхара вёскі Хобнае Калінкавіцкага раёна, якога камера зафіксавала, калі той ішоў са стрэльбай у руках.**

Праверкай устаноўлена, што згаданы грамадзянін, не маючы права на паляванне, вёў яго незаконна з выкарыстаннем незарэгістраванай у АУС гладкаствольнай двухствольнай паляўнічай стрэльбы маркі ТОЗ-БМ 16 калібру і 10 патронаў з карцеччу і кулямі, у сувязі з чым у дачыненні да яго распачаты адміністрацыйны працэс, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

Далей у ходзе агляду па месцы жыхарства парушальніка выяўлены два слоікі з порахам, адзін навучальны запал да вучэбнай супрацьтанкавай гранаты УПГ-8, 29 капсул, 55 гільзаў да гладкаствольнай стрэльбы 16 калібру, шрот, карцеч і кулі, а таксама металічная мерка для падрыхтоўкі патронаў (іншымі словамі, прыстасаванне для вырабу боепрыпасаў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Словы і справы

# ПАРТРЭТ МАЛАДОГА АКТЫВІСТА

## «малявалі» на Гомельшчыне

**Якасна новы ўзровень падрыхтоўкі ўдзельнікаў маладзёжнага саюза, стварэнне электроннай базы валанцёраў і медыя-хаба... На парозе якіх перамен і ноу-хау ў рабоце цяпер знаходзіцца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі? Перспектыўныя планы і актуальныя задачы абмеркавалі ў Гомелі падчас XXXIII справаздачна-выбарчай канферэнцыі абласнога камітэта ГА «БРСМ».**



Дарэчы, мерапрыемства, якое сабрала ў абласным цэнтры больш за 200 актывістаў саюза моладзі і арганізацый-партнёраў, дазволіла ў чарговы раз, як той казаў, зверыць гадзіннікі прадстаўнікам беларускага маладзёжнага руху. Перад пачаткам пазачарговага агульнарэспубліканскага з'езда БРСМ, моладзь Гомельшчыны атрымала магчымасць скансалідаваць ідэі і прапановы ў праект стратэгіі развіцця маладзёжнай арганізацыі на 2021—2025 гады.

Так, удзельнікі канферэнцыі ацанілі поспехі маладзёжнай палітыкі ў рэгіёне, звярнулі ўвагу на праблемныя пытанні. На абмеркаванне быў вынесены шэраг прапаноў і ініцыятыў, якія мяркуецца рэалізаваць на працягу бягучай пяцігодкі.

— Мы імкнёмся будаваць сваю работу такім чынам, каб зацікавіць маладых людзей, прыцягнуць іх да дзейнасці саюза не проста як пасіўных назіральнікаў, а як думаючых, крэатыўных і актыўных удзельнікаў і ініцыятараў мерапрыемстваў, праектаў, — адзначыла **першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта БРСМ Вераніка ГУДКОВА.**

Як вядома, арганізацыя БРСМ на Гомельшчыне па колькасці саступае толькі сталічнай. Многія маладзёжныя праекты, пра якія пачула ўся краіна, зарадзіліся таксама менавіта тут. Гэта і папулярныя цяпер «Тата-залы», і дзелавая гульня «Азбука грамадзяніна». Між тым, патэнцыял моладзі рэгіёна, упэўнена маладзёжны лідар вобласці, далёка не цалкам раскрыты. Як было адзначана, на будучую пяцігодку Гомельская абласная арганізацыя БРСМ плануе працягваць удасканальваць кадравую палітыку, укараняць новыя формы работы з маладымі людзьмі, уключанымі ў рэзерв кадраў.

Адзін з праектаў, якія мяркуюць укараняць, — «Школа маладога лідара». Дадзены вопыт забяспечыць больш паспяховую адаптацыю маладых спецыялістаў. У ліку важных прапаноў, агучаных гомельскім актывам, — правядзенне метадычных заняткаў для ўсіх суарганізатараў студатрадаўскага руху. Ёсць намер распрацаваць пакрокавую інструкцыю для прадпрыемстваў і арганізацый, якія даюць рабочыя месцы студэнтам. Сярод прапаноў — стварэнне электроннай базы валанцёраў. Яна будзе фіксаваць іх работу і дасягненні ў цэлым. Таксама плануецца развіваць такі праект як стварэнне медыя-хаба — маштабнай віртуальнай прасторы для ўзаемадзеяння моладзі, абмену вопытам і ахопу новай маладзёжнай аўдыторыі.

— Мы, БРСМ, — прэзідэнцкая арганізацыя. Такую ўнікальную падтрымку, якая ёсць у нашай арганізацыі і ў цэлым у беларускай моладзі, у свеце яшчэ пашукаць трэба. І гэта не проста падтрымка, але і вялікая адказнасць, — звярнуўся да моладзі рэгіёна **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Дзмітрый ВАРАНЮК.** — Сёння наша мэта — выбудаваць стратэгію развіцця на найбліжэйшыя пяць гадоў. Гэта, безумоўна, і рэфармацыя нашага руху, і, магчыма, змяненне назвы арганізацыі, атрыбутыкі, брэнда, гэта і новыя падыходы да ўнутранага саставу арганізацыі, пераразмеркаванне самых розных юрыдычных паўнамоцтваў і многае іншае, — падкрэсліў Дзмітрый Варанюк.

Свае пажаданні па далейшай рабоце маладзёжных лідараў рэгіёна выказаў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** У сваім звароце да ўдзельнікаў справаздачна-выбарчай канферэнцыі кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што значныя намаганні павінны быць накіраваны на павышэнне сацыяльнай актыўнасці членаў арганізацыі, жывыя зносіны і развіццё новых ідэй. Адным з найбольш важных кірункаў у рабоце маладзёжнай арганізацыі павінна заставацца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне.

— У вас у статуце напісана: саюз моладзі створаны для канкрэтных спраў і карысных пачынанняў, — адзначыў губернатар. — Прынцып «роўны роўнаму» павінен рэалізоўвацца не толькі на мерапрыемствах, але нават больш у нефармальнай абстаноўцы. Важна весці ненадакучлівую, але паслядоўную работу па выхаванні павагі да дзяржаўных сімвалаў, нацыянальных традыцый. Вывучэнне гісторыі, яе сапраўдных герояў павінна цалкам спыніць на падсвядомым узроўні любыя спробы яе перапісаць, — упэўнены Генадзь Салавей.

Дарэчы, кіраўнік рэгіёна адзначыў важнасць укаранення новых формаў работы, што цікавыя моладзі і карысныя для грамадства. Сярод яскравых прыкладаў такога падыходу — ініцыятыва гамяльчанкі Дзіяны Шмайловай, якая ў няпросты для краіны перыяд пасля 9 жніўня мінулага года занялася стварэннем упрыгажэнняў у колерах дзяржаўнага сцяга. Сёння яе патрыятычнае хобі перарасло ў справу жыцця, у хэнд-мэйд рамесніка.

Як прыклад патрыятычнага і працоўнага выхавання быў адзначаны водгук моладзі рэгіёна на народны праект захавання ваеннай памяці — добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол мемарыяла «Партызанская крынічка». Там практычна штодзень працуе некалькі дзясяткаў валанцёраў з ліку навучэнцаў і студэнтаў. Іх рабочыя змены пачынаюцца з пазнавальных лекцый аб ваеннай гісторыі і ўкладзе ў перамогу партызанскага атрада «Бальшавік». У абнаўленне помніка ў гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны ўжо зрабіла свой унёсак больш за тысячу юнакоў і дзяўчат з Гомеля, Добрушскага, Веткаўскага і Гомельскага раёнаў.

Між тым, як было адзначана, уражвае і развіццё студатрадаўскага руху ў рэгіёне. У гэтым працоўным семестры адпрацавала ўжо каля дзвюх тысяч байцоў атрадаў, з іх значная колькасць — непаўналетнія. Статус абласной маладзёжнай будоўлі мае сацыяльна значны аб'ект — узвядзенне школы ў мікрараёне «Хутар» у Гомелі. На палях рэгіёна працуюць 94 маладзёжныя экіпажы камбайнераў і 82 маладыя кіроўцы. Пяць маладзёжных экіпажаў намалацілі больш за тысячу тон збожжа, у рэгіёне таксама — дзевяць маладых вадзіцеляў-тысячнікаў.

Старшыня аблвыканкама, карыстаючыся магчымасцю, звярнуўся да моладзі з пасылам — пазбаўляцца ад скептыцызму у дачыненні да працаўладкавання ў сферы АПК, бо дадзеная галіна мае сур'ёзныя перспектывы. Увогуле, упэўнены кіраўнік рэгіёна, моладзі вельмі важна быць у курсе таго, як развіваецца прамысловы патэнцыял вобласці, рэалізоўваюцца найбуйнейшыя інвестпраекты. Актуальна таксама ўкараняць праекты па прамысловым турызме, развіваць цікавыя маладзёжныя ініцыятывы па прапагандзе здаровага спосабу жыцця, спорту і турызму.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

На слыху

# АПЕРАЦЫЯ «ПОШУК» НА ДЗІКІМ БАЛОЦЕ

## Як нядаўна шукалі траіх падлеткаў на небяспечнай дрыгве ў пушчы

**Здарэнне адбылося на мінулым тыдні. Якраз на другі дзень пасля падзеі мне давялося пабываць у камандзіроўцы ў Свіслацкім раёне. Як аказалася, падлеткі заблукалі ў тым самым лесе, дзе некалькі гадоў таму знік Максім Мархалюк. Яны, як і хлопчык, пайшлі ў лес у грыбы. На шчасце, падлеткаў удалося знайсці.**

Аб чарговым выпадку блукання мы гутарым з **першым намеснікам начальніка Свіслацкага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Дзянісам ЛЕГЕНЧУКОМ.** У першую чаргу ён заўважае, што заблукаць у тутэйшых мясцінах нескладана: блукаюць і мясцовыя жыхары, асабліва калі трапляюць на балота Дзікае. Яно знаходзіцца ў Белавежскай пушчы і з'яўляецца адным з самых старажытных балот Еўропы. Кажуць, што яму больш за шэсць тысяч гадоў, а глыбіня торфу — да трох метраў. Гэта вельмі небяспечныя мясціны — адным словам, дрыгва.

Плошча балота даволі вялікая — большая за 20 тысяч гектараў. На Свіслацкі раён прыпадае даволі значная частка тэрыторыі Белавежскай пушчы. Менавіта тут вяліся пошукі 11-гадовага Максіма Мархалюка, лёс якога да гэтага часу невядомы. Па словах Дзяніса Легенчука, тады нават ратавальнікі праваліваліся па пояс і па грудзі.

— Трапіць у такую рытвіну вельмі небяспечна, нават мясцовыя жыхары абыходзяць балота. Калі абысці яго, можна выйсці на пружанскую дарогу. Гэта суседні раён. Рэзкай мяжы ў балота няма, — адзначыў прадстаўнік раённага аддзела МНС.

Менавіта ў такую балоцістую мясцовасць і трапілі трое падлеткаў, якія прыехалі да бабулі ў вёску Новы Двор. (Дарэчы, з гэтай вескі родам і зніклы Максім Мархалюк.) Брат с сястрой — з Бераставіцы, а іх знаёмы — з Мінска. Усім па 15-16 гадоў. Вырашылі пайсці ў лісічкі, зарабіць крыху грошай. Даехалі да месца на аўтамабілі і пайшлі ў лес. Вельмі добра тое, кажа мой суразмоўнік, што яны трымаліся адно аднаго, інакш прыйшлося б шукаць кожнага паасобку, што значна ўскладняе працэс.

Увогуле, інфармацыя пра зніклых паступіла каля 22 гадзін 2 жніўня. Дыспетчар падняў трубку і атрымаў паведамлене аб тым, што трое дзяцей з аграгарадка Новы Двор заблукалі ў лясным масіве. Пайшлі ў грыбы і не вярнуліся ў вызначаны час. Іх даставіў туды знаёмы на аўтамабілі, і калі прыехаў забіраць, тых на месцы не было.

У падлеткаў таксама быў адзін тэлефон на траіх, але ён разрадзіўся, астатнія тэлефоны і цёплыя рэчы засталіся ў машыне.

Па словах Дзяніса Легенчука, дзесьці каля шасці гадзін вечара падлеткі зразумелі, што заблукалі. Яны спачатку самі спрабавалі шукаць патрэбны напрамак у бок Новага Двара. Але на самай справе атрымалася, што пайшлі ў супрацьлеглы бок, а гэта значыць, у бок таго самага балота Дзікае.

Між іншым, грыбнікі не разгубіліся. Як толькі заўважылі, што праз абутак прасочваецца вада, знайшлі больш сухое месца з паваленым дрэвам і там перасядзелі ноч.

Як потым расказалі ратавальнікам самі падлеткі, менавіта дзяўчына выказала прапанову застацца на месцы і нікуды не хадзіць. Яна аказалася найбольш падрыхтаванай, бо ў 8-м класе праходзіла курсы МНС. А там адпрацоўваліся і падобныя сітуацыі. Галоўнае, падкрэсліў мой суразмоўнік, ні ў якім разе не панікаваць. Гэта тое, што засвоіла дзяўчына. Таму і прапанавала застацца на адным месцы, перачакаць цемру, а калі пачне світаць, ісці па сцежках. Яны, па сутнасці, потым і выйшлі на тую сцежку, па якой ішлі да балота.

Вядома, у раёне не чакалі, пакуль развіднее, а тут жа пачалі актыўныя пошукі. Махавік дапамогі раскруціўся, што называецца, на поўную.

— Самае асноўнае, — падкрэсліў супрацоўнік МНС, — хутка апавясціць усіх зацікаўленых. А гэта райаддзел міліцыі, райвыканкам. У нас узаемасувязь са спецслужбамі горада, усе адразу апавяшчаюцца, аб'яўляецца сігнал «Збор», увесь асабовы склад збіраецца — і МНС, і РАУС, выязджаем на месца. У дадзеным выпадку мы паехалі на тое месца, дзе іх высадзіў знаёмы на машыне. Ён там знаходзіўся, даваў тлумачэнні. Усяго ў пошукавай аперацыі было задзейнічана больш за 20 адзінак тэхнікі і больш за 100 чалавек. Людзі самі прыбывалі, мясцовыя жыхары, добраахвотнікі. Увесь час пад'язджала і тэхніка — з Мінска, Брэста, Пінска, Гродна, пошукавыя атрады. У іх тэхніка — квадрацыклы, квадракоптары. Быў пагранічны атрад, леснікі, кінолагі з пошукавымі сабакамі. Ноччу арганізавалі аб'езд на квадрацыклах, на транспартных сродках з сірэнамі, з мігалкамі — там, дзе можна было праехаць. У некалькіх квадратах былі выстаўлены пажарныя цыстэрны, якія падавалі сігналы.

Потым падлеткі расказалі, што чулі гэтыя гукі, але ноччу не рашыліся ісці, бо маглі збіцца з-за рэха. А вось раніцай, як толькі развіднела, пайшлі па сцежках на гукі сірэны. Заблукалых знайшлі ўдзельнікі пошукавага атрада «Зубр». Іх прывезлі на квадрацыкле.

Аказалася, што яны знаходзіліся на даволі значнай адлегласці ад вёскі — кіламетраў дзесяць. А вось ад месца пошукаў недалёка — усяго 2,5 кіламетра. Але з-за таго, што трапілі на балота, рухацца было небяспечна.

— У гэтых лясах і дарослыя могуць згубіцца, праўда, выходзяць потым самі. Летась таксама быў выпадак — шукалі бабулю трое сутак, а яна самастойна выйшла зусім у іншую вёску, — расказаў супрацоўнік МНС.

Як аказалася, падлеткі заблукалі ў тым самым лесе, дзе знік Максім Мархалюк. Яны былі яшчэ далей ад месца шалаша хлопчыка. Але іх было трое. Супрацоўнікі МНС не сумняваліся, што тых знойдуць. Праўда, стрэсавую сітуацыю прадбачылі, таму дзяцей чакалі псіхолагі, прычым, адразу некалькі. Вядома, кожны з іх па-свойму перажываў здарэнне, але ўсе трое сцвярджалі, што добра ведалі лес і былі ўпэўненыя, што ідуць правільна. І вельмі здзівіліся, калі раптам апынуліся каля балота.

У такіх сітуацыях вельмі важна не разгубіцца, кажа супрацоўнік МНС. Ісці трэба па знаёмых мясцінах і абавязкова мець з сабой заплечнік з вадой, вяроўкай і запалкамі. І, вядома, тэлефон і запас ежы.

Дарэчы, падлеткі ўсё ж набралі лісічак. Ажно шэсць кілаграмаў. Як яны тады прызналіся, здадуць іх, каб купіць розных прысмакаў і заесці стрэс...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Кожны трэці

# «ГЛЯДЗІ, КАБ ПРЫ ЧУЖЫХ ЛЮДЗЯХ ТЫ

## Трагедыя сям'і Міхася Лынькова

***«Гэта не страшна», — так суцяшала яго маці ў гэтыя два дні, неаднойчы прыкрываючы яго сваім целам, калі чорныя цені самалётных крылляў праносіліся над імі і пыльная, белесаватая шаша раптам рабілася чорнай ад фантанаў гразі, ад тарфяных камякоў, веерам асыпаўшых дарогу...»***

**Гэта ўрывак з апавядання Міхася Лынькова «Дзіцячы башмачок» пра тое, як фашысцкія карнікі забіваюць маленькага хлопчыка, які пабег услед за сваёй маці-яўрэйкай, схопленай імі... У адным з лістоў пісьменнік скажа: «Апавяданне «Дзіцячы башмачок» не зусім аўтабіяграфічнае, але гэта, як гаворыцца, не мяняе справы».**

**Лынькоў, які працаваў у франтавой прэсе, бачыў на свае вочы свежыя сляды злачынстваў акупантаў, быў у лагеры Трасцянец адразу пасля вызвалення, глядзеў на абгарэлыя, скалечаныя трупы дзяцей і горы знятых з вязняў рэчаў, чуў галашэнне жанчын... Але была ў яго яшчэ і асабістая трагедыя, якая кіравала ягоным пяром і рвала сэрца...**

### «НА УЧЕТЕ ЭВАКУИРОВАННЫХ НЕ СОСТОЯТ...»

У фондзе Міхася Лынькова ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва сярод іншага захоўваюцца два дакументы, паштоўкі-бланкі, адпраўленыя з Бугуруслана на імя М. Лынькова. Першае адрасаванае на палявую паштовую станцыю № 127:

«Тов. Лынков!

На ваш запрос сообщаем, что сведения о местонахождении ваших жены и сына пока не получены. По получении полных материалов учета на Ваш запрос сообщим дополнительно.

Переселенческое Управление при СНК СССР. 26.11.1941 г.»

Другая паштоўка адпраўлена Лынькову ў Маскву, у Саюз пісьменнікаў СССР:

«Центральное Справочное бюро сообщает, что 1. Аренкова Хана Абрамовна 2. Лыньков Марк Михайлович 9 л. из Минска на учете эвакуированных не состоят.

Переселенческое Управление при СНК СССР. 25.08.1942».







Пачатак і канец гэтай гісторыі засталіся ў двух апавяданнях...

Пачатак — гэта, безумоўна, апавяданне Міхася Лынькова «Гой», напісанае ў 1926 годзе. Гэта, дарэчы, першы твор на беларускай мове, які быў прачытаны Васілём Быкавым і зрабіў на яго вялікае ўражанне. Апавяданне аўтабіяграфічнае: чырвоаармеец Міхась пакахаў дзяўчыну-яўрэйку, дачку гаспадароў хаты, дзе аднойчы спыніўся... Рыва таксама шчыра пакахала госця — але гэта парушае ўсе спрадвечныя традыцыі. Бацькі выракаюцца дзяўчыны, саромяць яе, суседзі пляткараць... Але каханне перамагае, Міхась са сваім атрадам абараняе мястэчка ад бандытаў, у іх з Рывай утвараецца моцная сям'я, новыя сваякі палюбілі зяця...

Жыццёвая канва такая. Міхась Лынькоў, чырвоны камандзір, ажаніўся з настаўніцай са Свержаня Ханай Абрамаўнай Аранковай. Кажуць, адукаваная, разумная жанчына яшчэ і дапамагала мужу ў напісанні, рэдагаванні першых апавяданняў, якія прынеслі яму славу. Нарадзіўся сын Марык...

Вось як успамінае пра іх сям'ю Віталь Вольскі, чые ўспаміны таксама захоўваюцца ў архіве:

*«Маўклівы, стрыманы чалавек, які пазбягаў праяўлення пачуцця, вельмі любіў свайго маленькага сына. Ён клікаў хлопчыка звычайна:*

*— Маркушка!..*

*І ў голасе яго гучалі лагодныя, цёплыя і пяшчотныя інтанацыі.*

*Сціпласці ён патрабаваў і ад членаў сваёй сям'і. Ад Ханы Абрамаўны гэта можна было і не патрабаваць. Невялікая ростам, яна і сама была па ўсёй сваёй сутнасці сціплай і непрыкметнай. Побач з Лыньковым не кідалася ў вочы, стушоўвалася, трымалася заўсёды на заднім плане. Ні ад каго ніколі і нічога не патрабавала, у тым ліку і ад мужа. Абмяжоўвалася ў жыцці толькі самым неабходным. Гэта была ціхая, адданая і ўважлівая жонка. У мінулым настаўніца, яна высока шанавала літаратуру наогул і працу пісьменніка ў прыватнасці. Гэтую працу яна лічыла штодзённым подзвігам... У такім разуменні Хана Лынькова выхоўвала і свайго сына. Адносіны яе да мужа былі поўныя пашаны, бязмежнай веры і замілавання. Для Міхася Лынькова яна была не толькі адданай сяброўкай і памочніцай, і не толькі добрай хатняй гаспадыняй, але і надзейнай апорай, маральнай падтрымкай у нялёгкім і складаным жыцці дваццатых-трыццатых гадоў. Сціплым, далікатным і добра выхаваным быў і Марык. Карыя вочы яго, ясныя і шчырыя, свяціліся добразычлівасцю. Гэты мілы хлопчык, разумны і ўдумлівы, выклікаў пачуццё сімпатыі ва ўсіх, хто яго ведаў».*

А пасля пачалася вайна...

Пачытаем пра гэта ўспаміны Міхася Лынькова з таго ж фонду, напісаныя ў 1960-я гады для часопіса «Советское фото»:

*«Война застала нас в дороге.*

*Мы, трое белорусских писателей — народный поэт Янка Купала, поэт Петрусь Бровка и автор этих строк — возвращались из Риги, где мы были гостями на первом съезде латышских писателей. Ехали домой вместе с литовскими товарищами. Настроение у всех было приподнятое. Литовские писатели пригласили нас погостить день-другой в их столице. Мы остались у них. День прошел в радушных встречах, дружеских беседах, литературных выступлениях. А наутро следующего дня мы проснулись от грохота бомбежки — немцы бомбили город, вокзал, железную дорогу».*

Важных гасцей, нягледзячы на цяжкасці, удалося адправіць у



**Марык Лынькоў.**

Мінск — на апошнім цягніку-«лятучцы» з некалькіх вагонаў. Але з сям'ёй Лынькову злучыцца не ўдалося — давялося самому пешкі выпраўляцца ў эвакуацыю... Хана з Марыкам засталіся на акупаванай тэрыторыі.

### «И ПЛАЧ, И СЛЕЗЫ, И ГОРЕ, И ОБМОРОК»

З дакументаў вынікае, што Лынькоў адразу ж пачаў шукаць сляды сваіх родных... Дарэмна. У фондзе захоўваецца перапіска яго з жончыным братам, Ісакам Аранковым. Той таксама расшукваў зніклую радзіну, вельмі ўзрадаваўся, калі ўбачыў у «Известиях» за 18 сакавіка 1942 года артыкул «Мать», падпісаны «М. Лыньков». Пачаў слаць лісты — у рэдакцыю, у Саюз пісьменнікаў, каб здабыць адрас мужа любай сястры. Слаў «дорогому Мише» ліст за лістом, у якіх прасіў, каб Ханка напісала хоць некалькі радкоў, ці калі яе няма ў Маскве, Лынькоў даў яе адрас... Ды хоць штось паведаміў пра яе і Марыка! Бо з акупаванай тэрыторыі даходзілі самыя жудасныя звесткі пра лёс людзей, што там засталіся.

*«Миша! Прошу вас, сообщите, что вам известно (если известно) про Хану и Маричка. Быть может им удалось каким-нибудь путем спастись».*

Тон лістоў робіцца ўсё больш безнадзейным.

*«Где Хана с Маричком? Неужели их нет и не будет среди нас? Напишите все, что Вам известно про Хану и Марика. Не верится, что их нет, а вместе с тем, думы тяжёлые и нехорошие про нее. Успела ли она выскочить из ада, когда гитлеровская чума налетела на Минск в 1941 г.»*

Урэшце, у 1943-м, пачалося вызваленне Беларусі, стала даступна больш звестак. Аранкоў піша Лынькову, ад якога яшчэ не атрымаў адказу, пра лёс родных сваёй жонкі Рахілі:

*«Вчера получил письмо из Студенца от знакомого. Письмо из того места, где работал с 1926 года до 12.08.1941 г., которое было под немецким игом 2 г. 4 месяца. Письмо невеселое, коротко оно написано, много сказано в нем. Первая весть, что брат, жена его, малолетние дети их после пыток, 22.12.1942 г. расстреляны. Вторая весть, что сестра жены с семьей (малолетними детьми) 22.12.1942 тоже извергами расстреляны. Она 12.08.1941 г. эвакуировалась, но по пути была перехвачена головорезами и пригнана в Студенец назад. Третья весть, единственного оставшегося в живых брата ее, который до войны жил и работал в Москве, тоже нет... В 1941 г. пошел в партизанский отряд. Действовал в родных местах. В конце декабря 1942 г. был в Студенце. Там же был схвачен гестаповцами. После пыток, истязаний... убит был, точнее, добит. Конечно, ничего не могли добиться гестаповцы. Село сгорело. Отряд факельщиков перед отступлением «работу» свою выполнял. И плач, и слезы, и горе, и обморок... Уверен, Миша, что нашей Ханы с Маричком тоже нет. Их век, видимо, укорочен. Уверен, что никого из моих братьев и сестер нет. Остались вы (и то нет уверенности) и сестра жены, живущая в Москве со своей семьею и другая сестра ее — одиночка, лишившаяся своей семьи (один-единственый сын тоже погиб) — живущая с нами».*

А потым Міхась Лынькоў, адазваўшыся, пацвердзіў швагру, што той прадчуваў... Аранкоў піша:

*«Как-то не верится, что Ханы с Маричком среди нас нет. А какая она была тихая и скромная. Всегда без гордости и зазнайства. Только начала жить. И не пришлось. А Марик, бедный Маричек, ушел и ты за своей мамой вслед».*

Потым Ісак Аранкоў паведамляе Лынькову пра сваю радню:

*«Несколько дней тому назад я получил письмо из Сверженя. Хорошего ничего нет. И там такое же горе нанес кровавый бандит — Гитлер. Мойсей наш покончил самоубийством (не хотел, видимо, попасть в руки немцам, или по другой причине). Иосифа, Сарры, Миня и их семейств нет уже в живых с 27. 11 1941 г. Они уже не поднимутся, как не поднимутся Хана с Мариком. Они уже спят вечным сном... Даже не верится, не верится, когда буду в Минске, что меня Хана не встретит и что Марик не будет около нее вертеться, или около своих игрушек.*

*На том месте, где жил брат с семьей в 5 человек, сестра с маленькими детьми (род Рахили — Студенец), стоят трубы и бугорки. Это и вся память, что были у нее братья и сестры».*

### ХЛОПЧЫК, ЯКОГА ЎСЕ ЛЮБІЛІ...

Што ж здарылася з Ханай і Марыкам?

Звернемся да другога апавядання...

Віталь Вольскі піша: *«Пра ўсё гэта з вялікай праніклівасцю, з глыбокім стрыманым жалем і спачуваннем, з выдатным веданнем і разуменнем псіхалогіі дзіцяці наогул і характару васьмігадовага Марыка ў прыватнасці, расказаў далёкі ад сантыментаў Янка Маўр у сваім апавяданні «Завошта?», якое ён прысвяціў «светлай памяці М. Л.» Няхай той, хто не чытаў апавяданне, абавязкова прачытае яго, а хто чытаў, няхай прачытае яшчэ раз, бо героем твору быў пад іменем Мішы ніхто іншы, як Марык Лынькоў. Янка Маўр добра ведаў Марыка, бо на працягу некалькіх гадоў жыў па суседству з сям'ёй Лыньковых у драўляным двухпавярховым доме ў завулку Апанскага і часта наглядаў за гульнямі дзяцей на двары гэтага дома, а таксама і ў парку Дома творчасці ў Пухавічах, дзе сям'я Лыньковых жыла разам з сем'ямі іншых пісьменнікаў кожнае лета на працягу 1935-40 гадоў і дзе часта бываў і сам Янка Маўр. Я адсылаю да апавядання «Завошта?» кожнага з тых, хто хоча даведацца пра абставіны гібелі Ханы Лыньковай і хлопчыка Марыка і зразумець усю глыбіню асабістай трагедыі Міхася Лынькова. Сам ён адным з першых прачытаў апавяданне, але нікому не сказаў пра яго ні слова».*

Хлопчык Мішка з апавядання — цудоўны, удумлівы, добры... Ён ратуе ўсіх жывых істот, ад казюркі да шчанючка, калі на яго нападае меншы за яго хлопчык — не б'ецца ў адказ, бо той слабейшы, затое не баіцца абараніць сябе ад мацнейшых... З пачаткам вайны Мішка і яго мама пакінулі горад, у які ўварваўся вораг.

*«Затым пачалося вандраванне. Нібы жабракі, хадзілі яны ад вёскі да вёскі некалькі дзён. Начавалі то ў пуні, то ў хаце. Нікуды не спяшаліся, часта адпачывалі. Навакол было ціха, спакойна, нібы і вайны ніякай няма.*

*Праз некалькі дзён яны спыніліся ў адной вёсцы назусім. Тут жыла сястра Мішавага бацькі, калгасніца».*

Сваякі прытулілі Мішку і ягоную маці. Нават выправілі ёй дакументы, што яна ўкраінка.

*«А як любіў Міша сваю маму! Ён увесь быў прасякнуты пачуццём, ён дыхаў ёю, як паветрам. Ён цягнуўся да яе, як расліна да сонца. Асабліва цяпер, калі не было бацькі, якога ён любіў не меней, калі не болей за маці. Бацька быў яго найлепшым сябрам і таварышам, з якім яны цэлымі гадзінамі гутарылі, майстравалі, займаліся самымі цікавейшымі справамі. Бацька здабываў і выдумляў для Мішы такое, чаго нідзе не знойдзеш.*

*Але далёка цяпер татка. Ён б'е фашыстаў. Калі паб'е, тады яны зноў сыдуцца. А пакуль трэба цярпець і чакаць. Пакуль што яны стараліся зліцца з мясцовым насельніцтвам, каб нічым не вылучацца. Мама хадзіла на сялянскія работы, а Міша рабіў усё тое, што робяць сялянскія дзеці.*

*— Глядзі, Мішачка, каб пры чужых людзях ты не назваў мяне мамай. А калі са мной што здарыцца, ну, скажам, схопяць мяне, то ты*

# НЕ НАЗВАЎ МЯНЕ МАМАЙ...»




*нават і не глядзі ў мой бок і трымай сябе так, як усе іншыя дзеці.*

*Міша пазіраў на яе сваімі вялікімі ўдумлівымі вачыма і ціха казаў:*

*— Я ўсё роўна не разлучуся з табою».*

Радня дамовілася, што ў выпадку страшнага, калі хто-небудзь данясе, што ў хаце жывe яўрэйка, Мішку гаспадары выдадуць за свайго сына. І страшны момант надышоў... Невядома, хто данёс — але да хаты пад'ехалі фашысты. Не дапамагла фальшывая даведка пра ўкраінскае паходжанне — Мішкаву маці забралі...

*«Наперадзе — немец, ззаду — два паліцаі. Па баках стаяць людзі, адны ўздыхаюць, другія плачуць, трэція сціскаюць кулакі. Тут, паміж іх, знаходзіцца яе Міша, хлопчык, якога пачынае горача любіць кожны, хто толькі яго ўбачыць. Ён вось тут, зусім блізенька, яна зараз пройдзе каля яго, можа, нават дакранецца да яго... Але нельга, нельга глядзець у гэты бок, бо яна можа не вытрымаць... А яшчэ хутчэй можа быць — ён не вытрымае.*

*Яна і не глядзіць у гэты бок, але ўсё роўна, мусіць, усімі клеткамі свайго цела бачыць, як ён праціскаецца наперад, а цётка Алеся, дзед Карней і іншыя жанчыны ціхенька, лагодненька адціскаюць яго, засланяюць ад немцаў і... ад мамы. І людзі гэтыя таксама думаюць аб адным: ці вытрымае такую пакуту хлопчык?*

*...Міша кідаўся наперад то ў адным, то ў другім месцы, каб зірнуць на маму, але ўсюды натыкаўся на цётку або дзядзьку. Ён высоўваў галаву з-за спіны, з-пад рукі — і ўсюды гэтыя рукі ласкава затрымлівалі яго, пяшчотна гладзілі па галаве, і то над адным, то над другім вухам чуўся ціхі шэпт: «Маўчы, Мішачка, маўчы, усё будзе добра, мама вернецца».*

І беднае дзіця не вытрымала. Калі Мішка ўбачыў, што маці азірнулася, калі яе садзілі ў грузавік, закрычаў: «Мама!»

Яго тут жа схапілі і кінулі ў машыну. Дарэмна маці сцвярджала, быццам не ведае гэтага хлопчыка, і людзі таксама пацверджвалі — не ейны сын...

Маці з сынам апынуліся ў канцлагеры... Іх чакала толькі смерць.

*«— Нічога, Мішачка, перацерпім усё гэта... Нас павядуць, пастаўяць на краі ямiны і будуць страляць. Але ты не бойся — гэта зусім не балюча. Стукне нібы каменем, у цябе закружыцца галава — і ты заснеш. І ўсё.*

*...І дзень гэты прыйшоў. Сабралі іх у адну кучу многа-многа. Тут былі і старыя з сівымі барадамі, і маладыя, і такія, як Міша, і зусім малечечкія, на руках у мам. А жанчын было яшчэ болей. І ўсе плакалі, енчылі. Толькі Мішава мама не плакала: яна нібы нічога не чула, не бачыла, не разумела.*

*— Мама, нас ужо расстрэльваць павядуць? — спытаў Міша такім тонам, нібы справа ішла аб чымсьці звычайным.*

*Тут Міша адчуў, як мама схапіла яго, падняла на рукі і прытуліла да сябе так, што ён больш нічога не бачыў, а толькі чуў, як стукае маміна сэрца.*

*— Не бойся, дзіця маё, — пачуў ён ціхі голас.*

*І яму зрабілася так цёпла, так соладка на грудзях у мамы, так захацелася заснуць...*

*Тады яго моцна стукнула ў адным месцы, у другім — і яны з мамай кудысьці паляцелі...»*

Немагчыма спакойна чытаць гэты аповед... Тым больш ведаючы, што там усё праўдзіва. Сваякі пацвярджалі: менавіта так было... Пацвярджала і Ганна Ціханаўна, сястра Лынькова, у якой каля Старых Дарог у 1942-м і жылі Хана Абрамаўна з Марыкам. Калі пачалі хапаць яўрэяў, Марыка з маці хацелі пераправіць да партызанаў, але не паспелі. Калі Хану схапілі, муж Ганны Ціханаўны сказаў пра Марыка, які быў падобны да бацькі, што гэта ягоны сын, фашысты паверылі... А далей здарылася так, як у апавяданні.

## ЗАБЫЦЬ НЕМАГЧЫМА...

На Кургане Славы, які ў 1971-м адкрылі пад Слуцкам, на мемарыяльнай пліце значацца імёны Ханы Абрамаўны і Марыка. А таксама яшчэ імёны сваякоў Міхася Лынькова. Ягонага брата Рыгора, які праславіўся як паэт пад псеўданімам Рыгор Суніца. Рыгор знік без вестак на фронце ў 1941-м. Ён таксама быў жанаты на яўрэйцы, маладой настаўніцы Гені Рыгораўне Лерман — прычым сястра Гені выйшла замуж за паэта Васіля Вітку. Геню з двухгадовай дачушкай таксама забілі фашысты ў Старых Дарогах, цалкам магчыма, разам з Ханай і Марыкам.

Сям'я Лынькоўых была вельмі дружная. Міхась, старэйшы сын, пасля смерці бацькоў узваліў на сябе клопат пра малодшых, так што быў ім, відаць, і за бацьку. Сястра Ганна з мужам апынуліся ў партызанскім атрадзе, у брыгадзе Васіля Казлова. Другі брат Лынькова Мікалай нейкі час быў у эвакуацыі, ён сябраваў з Кандратам Крапівой, у Ташкенце часта наведваў Якуба Коласа... Потым трапіў усё-ткі на фронт. Даведаўшыся страшную вестку пра лёс сям'і брата, піша:

*«Здравствуй, дорогой Миша! Получил я твое письмо и несколько дней никак не решался что-либо тебе написать. Что мне тебе написать — старшему брату — отцу. Утешить тебя мне не под силу. Слишком тяжелое горе выпало на твою долю».*

